МІНСК СТАНЕ РАЗУМНЫМ ГОРАДАМ 4

СТУДЭНТ ГОДА — ХТО ЁН? 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

2 ЛЮТАГА 2021 г. АЎТОРАК № 19 (29388)

Расце біятлонная змена

Фота БелТА.

Спаборніцтвы сярод дзяцей і падлеткаў па біятлоне «Снежны снайпер», якія праходзяць штогод, дазваляюць убачыць маладыя таленты гэтага надзвычай папулярнага ў нашай краіне віду спорту. Цяпер для юных лыжнікаў-стралкоў праводзяцца абласныя этапы. Удзельніцу аднаго з іх — Гомельскага — Аксану ПІМЕНАВУ фотакарэспандэнт зняў якраз перад адказным стартам.

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый ЯРАШЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі:

«Мы ведаем, што трэба, каб рэгіёны ажылі. Гэта, вядома, вытворчыя месцы, сацыяльная інфраструктура. І тут усё неабходнае ў нас ёсць: і задумкі, і заканадаўства, якое апрабавалі на Аршанскім рэгіёне. Зараз мы працуем над тым, каб нейкія нормы гэтага ўказа, эксперыменту распаўсюдзіць на астатнія рэгіёны. У любым выпадку, прэферэнцыі будуць».

КАРАТКА

- **ЕАЭС мае намер стварыць зоны свабоднага гандлю з Егіптам, Індыяй, Інданезіяй і Манголіяй.**
- КДК: па выніках маніторынгу амаль кожнае другое гаспадарчае таварыства Мінскай вобласці недаплаціла дывідэнды ў бюджэт.
- **Мінэканомікі прапануе абмеркаваць змены ў электронных таргах па продажы маёмасці пры банкруцтве.**
- «Белавія» адкрывае новы напрамак Мінск—Дубай—Мінск.
- **У Гомельскім дзяржаўным цырку адбыўся прэм'ерны паказ новай праграмы «Карнавал жывёл».**

- Дацкі Чырвоны Крыж перадаў у Беларусь 1,32 млн ахоўных масак.

ISSN 1990 — 763X

Класныя навіны

«ЛІЧБА» Ў ГЛЫБІНЦЫ НЕ АДСТАЕ

У школах і іншых навучальных установах Падзвіння ў апошні час усё часцей абсталёўваюць новыя камп'ютарныя класы. І, што вельмі справядліва, не толькі ў абласным цэнтры і буйных гарадах, але і ў глыбінцы. Дарэчы, ужо шмат вясковых школ можа даць фору віцебскім у пытанні камп'ютарызацыі.

Фота Алега КЛІМОВІЧА.

СТАР. 8

У цэнтры ўвагі

На мэце — пабудова інтэлектуальнай краіны

Беларусаў новай фармацыі трэба выхоўваць у сабе

«Тое, якія задачы вырашае дзяржава, у многім характарызуе яе сталасць. Калі на парадку дня ў нас стаяць такія маштабныя стваральныя мэты, як лічбавая трансфармацыя эканомікі, адрасная мадэрнізацыя прамысловасці, развіццё электратранспарту, стварэнне ўласнай вакцыны ад каранавіруса, асваенне атамнай энергетыкі, пашырэнне ўласнай групоўкі касмічных спадарожнікаў і на аснове ўсяго гэтага — рост якасці жыцця насельніцтва, то можна сцвярджаць, што наша краіна ўпэўнена глядзіць у будучыню. Яе неабходна будаваць, не разбураючы, а развіваючы і прымнажаючы нацыянальныя здабыткі», — такую думку выказаў падчас круглага стала «Беларусь інтэлектуальная: адукацыя, інавацыі і высокія тэхналогіі» дырэктар Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Васіль ГУРСКІ.

Экспертны абмен думкамі адбыўся ў Нацыянальнай акадэміі навук у рамках грамадскага абмеркавання праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады. Удзел у мерапрыемстве ўзялі вядучыя навукоўцы, эканамісты і кіраўнікі навуковых устаноў акадэміі.

СТАР. 5

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы, як і раней, хочам быць астраўком бяспекі ў Еўропе, краінай, ад якой ідуць толькі мірныя ініцыятывы»

Пра гэта Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў, зацвярджаючы новае рашэнне на ахову Дзяржаўнай граніцы ў 2021 годзе. Гэта галоўны арганізацыйна-распрадчы дакумент, па якім сёлета будуць працаваць пагранічныя органы.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, «усе адчулі, што крыху перанапружылі сітуацыю з Узброенымі Сіламі, быццам бы пачалі бразгаць зброяй». «Нічога падобнага. Мы ніколі не бразгалі і бразгаць зброяй не збіраемся. ***Мы, як і раней, хочам быць астраўком бяспекі ў Еўропе, краінай, ад якой ідуць толькі мірныя ініцыятывы. Гэта наша перспектыва. Калі хтосьці не згодны — мы павінны адказваць. Гісторыя нас вучыць таму, каб мы заўсёды былі гатовыя адказаць на любую правакацыю»,*** — сказаў Прэзідэнт.

На сустрэчы ў Палацы Незалежнасці старшыня Дзяржпагранкамітэта Анатоль Лапо далажыў і пра вынікі дзейнасці падначаленага яму ведамства. Як адзначыў Прэзідэнт, у гэты час традыцыйна звяртаюцца да пытанняў пагранічнай бяспекі, зацвярджаючы дзейнасць пагранслужбы на год.

«Мінулы год для ўсіх нас быў праверкай, асабліва для людзей у пагонах, у тым ліку і для нашых пагранічных войскаў. Трэба сказаць, што, у асноўным, гэту праверку мы вытрымалі. Пагранічныя войскі па сваёй асноўнай спецыяльнасці і кірункам спрацавалі крыху лепш, чым іншыя сілавыя структуры. У цэлым, нармальна», — выказаў ацэнку кіраўнік краіны.

Прэс-служба Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі паведаміла пра асноўныя вынікі работы ведамства за мінулы год.

У цэлым, адзначаецца зніжэнне колькасці парушэнняў заканадаўства аб Дзяржаўнай граніцы больш чым у два разы (з 4 да 1,8 тысячы). Органы пагранслужбы самастойна і ва ўзаемадзеянні з іншымі ведамствамі выкрылі і спынілі 12 каналаў наркатрафіку. Таксама выкрыта 45 асоб, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці. Летась сфарміравана новая пагранічная застава «Дзяражычы» Гомельскай пагранічнай групы і дзве манеўраныя групы ў Гродзенскай пагрангрупе і Полацкім пагранатрадзе. Павялічана штатная колькасць (каля 50) дзеючых падраздзяленняў граніцы, у тым ліку ўзмоцнены і аддзяленні пагранічнага кантролю на латвійскім і ўкраінскім кірунках. Завершана ўкараненне сістэмы «электроннай чаргі» ў пункце пропуску «Брузгі». Працягваецца работа па перадачы мытні асобных функцый пагранічнікаў у пунктах пропуску «Новая Рудня», «Катлоўка», «Макраны» і «Свіслач».

Сумесна з Дзяржаўным пагранічным камітэтам праведзена мадэрнізацыя і рэканструкцыя пункта пропуску «Урбаны» на беларуска-латвійскай мяжы, працягваюцца работы ў пункце пропуску «Верхні Церабяжоў» на мяжы з Украінай, якія плануецца завяршыць у сакавіку гэтага года.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, традыцыйныя пагрозы, з якімі спраўляюцца пагранічнікі, — незаконная міграцыя, наркатрафік, кантрабанда, тэрарыстычныя намаганні. «Тут быццам бы і лічбы нядрэнныя. Справа ў тым, што мы ахоўваем не толькі Беларусь тут, на захадзе, — гэта і рубяжы Саюзнай дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт.

Ён канстатаваў, што пытанні пандэміі ўскладнілі работу пагранічнікам, мытнікам, але сітуацыя была кіраваная, два ведамствы дзейнічалі разам. «Кіраваная сітуацыя ў тым плане, што ўсякія мае распараджэнні хутка даводзіліся да войскаў і выконваліся, як ніколі. Значыць, армія, войскі і пагранічнікі адчулі, што трэба абараняць больш моцна, сур'ёзна краіну, таму рэакцыя была адпаведная. ***Гэта добра, што ў неабходны момант мы можам сабрацца і, калі трэба, адказаць»,*** — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, летась, як было ўстаноўлена планам на 2020 год, удасканальвалі пагранічныя войскі — з'явіліся новыя пагранічныя заставы, манеўраныя групы. Ён папрасіў асобна далажыць, ці створаны манеўраныя групы ўсюды, дзе планавалася: «Вы ж памятаеце: іх увогуле ліквідавалі — разумныя такія былі: нам, бачыце, яны непатрэбныя... Аказваецца, патрэбныя. Хоць невялікія, але ў кожным пагранічным атрадзе, групе павінны быць гэтыя манеўраныя групы. Для таго каб у кожны момант, кароткі прамежак часу прыкрыць неабходны кавалак граніцы, дапамагчы пагранічным заставам».

Прэзідэнт яшчэ раз падкрэсліў: зона ахаванай граніцы — амаль 2500 кіламетраў, і тут адказнасць нясём не толькі за Беларусь, але і за Расію, і дадаў: «Трэба аддаць належнае, што ўсё ж такі ўзровень аховы нашымі пагранічнікамі зоны адказнасці, я ўпэўнены, перавышае любую граніцу ў свеце».

Кіраўнік краіны звярнуў увагу, што граніца — гэта люстэрка, твар любой дзяржавы. «Таму я магу спрачацца з любым — няма такой аховы дзяржаўнай граніцы ў свеце, у іншай дзяржаве, як у Рэспубліцы Беларусь. На гэтым узроўні і неабходна падтрымліваць ахову Дзяржаўнай граніцы», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Марыя ДАДАЛКА.

● Каментарый у тэму

Па словах **старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Анатоля ЛАПО,** за мінулы год выкананы ўсе даручэнні і задачы кіраўніка краіны. Дзейнасць па ахове граніцы, установка новага абсталявання працягвацца сёлета. Будзе ўведзена ў сістэму новая сучасная пагранічная застава «Глушкавічы». Звярнуў увагу ў размове з журналістамі Анатоль Лапо і на цяжкасці мінулага года.

«Мінулы год быў асаблівым. Спачатку пандэмія, потым абстаноўка ўнутры краіны, ціск па-за межамі мы таксама адчувалі. Я вам не адкрыю сакрэт, калі скажу, што некалькі тысяч чалавек мы не пусцілі ў Беларусь, якія ехалі ў другім паўгоддзі з «рознымі» намерамі — гэта і спроба дэстабілізацыі абстаноўкі на прыбалтыйскім кірунку, і знакамітыя «ланцугі» («ланцугі салідарнасці» з людзей. — **«Зв.»**). Мы не дапусцілі», — дадаў старшыня ведамства.

Анатоль Лапо адзначыў, што з-за пандэміі граніцу не закрывалі, на другім этапе пандэміі толькі абмежавалі перамяшчэнне асобных катэгорый грамадзян.

«Грузавы транспарт як рухаўся, так і рухаецца, людзі ездзяць на работу. Калі чалавек прад'яўляе дакумент, што ён працуе ў краіне, мы яго пускаем, — заявіў Анатоль Лапо. — Работы ў нас менш не стала, а, наадварот, стала больш».

«Для мяне прырода — гэта абсалютны прыярытэт»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя Худыка

Кіраўнік краіны пачаў размову з заўвагі, што пандэмія каранавіруса — гэта Божае пакаранне для планеты, якое беларусы не заслугоўваюць. «Мабыць, мы, беларусы, пакуль гэтага ў такім аб'ёме не заслугоўваем сваімі адносінамі да прыроды. Але тое, што свет звар'яцеў і па-варварску эксплуатуе прыроду, знішчае прыроду — гэта факт. Таму для мяне прырода — гэта абсалютны прыярытэт. Ёсць прырода — ёсць жыццё. Няма прыроды — няма жыцця», — сказаў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў: чым больш па-хамску людзі адносяцца да прыродных рэсурсаў, тым горш жывуць, таму ён і надалей будзе аддаваць вялікую ўвагу ахове навакольнага асяроддзя. «Зразумела, што гэта водныя рэсурсы нашы, перадусім. Гэта лес, якім узнагародзіў нас Гасподзь. Гэта нашы балоты, што даюць асноўную частку кіслароду ў Беларусі і гэтак далей. І мы павінны ўсё гэта захоўваць як зрэнку вока. І самае галоўнае — жыць у гармоніі», — канстатаваў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт нагадаў, што прыгажосць айчыннай прыроды неабходна берагчы, захоўваючы парадак і прыбіраючы за сабою пасля наведвання прыродна-ландшафтных тэрыторый.

«Ахова навакольнага асяроддзя — гэта ваша вотчына, і вы самы першы і патрабавальны інспектар для тых, хто працуе ў лесе, перамяшчаца па рэках, рыбачыць на азёрах і гэтак далей. Як ідуць справы? Што вы бачыце, што вас не задавальняе? Як будзем працаваць далей?» — пералічыў Прэзідэнт пытанні, на якія хацеў атрымаць адказы ад міністра.

Кіраўнік краіны лічыць, што чалавек не можа нармальна жыць, калі ў яго загаджана ўсё навокал.

«Не можа. Таму я гляджу на малыя гарады, каб і ў Мінску былі чысціня і парадак, каб больш дрэў высаджвалі, каб па-варварску не адносіліся да гэтых дрэў і іншых насаджэнняў, каб усё было ў парадку», — дадаў ён.

Прэзідэнт папрасіў звярнуць у дакладзе асаблівую ўвагу на гідраметэаралогію. Некалькі гадоў таму, па словах кіраўніка краіны, ён выказваў сваё абурэнне тым, як працуе Белгідраметцэнтр.

«Павінен вам сказаць, што апошнім часам заварушыліся, і я вельмі ўважліва сачу за гэтым. На тры дні абсалютна дакладны прагноз і нават на тыдзень. Амаль ніколі не памыляюцца. Ну на паўградуса-градус. Выразна змяніліся. Але неабходна ў гэтым кірунку працаваць, бо былі выдаткаваны сродкі, куплялі новую тэхніку, абсталяванне, людзей у прытомнасць прывялі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

● Каментарый у тэму

Міністр Андрэй Худык паведаміў журналістам, што Прэзідэнт трымае пытанні аховы асяроддзя, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, эфектыўнага выкарыстання зямлі на асаблівым кантролі.

«Разам з тым вельмі складана трымаць справаздачу, таму што кіраўнік краіны глыбока валодае пытаннямі, за якія адказвае наша міністэрства, а дзейнасць міністэрства шматгранная. Вобразна кажучы, — ад крышталічнага фундамента нашай Зямлі да азонавага слою. Гэта ўсё Мінпрыроды абавязана кантраляваць, кіраваць такімі працэсамі, ахоўваць і памнажаць», — сказаў Андрэй Худык.

Па яго словах, Прэзідэнт даў даручэнні ўзмацняць работу ведамства па раней вызначаных кірунках. Перш за ўсё, гэта навядзенне парадку на зямлі, развіццё мінеральна-сыравіннай базы, застаецца пад увагай і дзейнасць гідраметэаралагічнай службы.

«Радуе тое, што ўсё менш нараканняў грамадскасці да нашага ведамства. Ёсць разуменне з грамадскімі арганізацыямі, нядрэнна, у цэлым, мы працуем з суседзямі і ў тых сусветных канвенцыях, краінай-удзельніцай якіх Беларусь з'яўляецца», — дадаў міністр.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Вайскоўцы ў М'янме абвясцілі надзвычайнае становішча

Прэзідэнт М'янмы Він М'ін і лідар Нацыянальнай лігі за дэмакратыю, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру Аун Сан Су Чжы былі затрыманы. Прэс-сакратар кіруючай партыі М'о Ньюн назваў тое, што адбываецца, спробай вайсковага пераваротy, паведаміла ТАСС. Тэлевізійная сетка Myawaddy, якая належыць вайскоўцам, перадала, што ваенныя краіны абвясцілі аб увядзенні надзвычайнага становішча тэрмінам на адзін год. Заява аб увядзенні адпаведнага рэжыму было падпісана віцэ-прэзідэнтам М'ін Све. Вайскоўцы абвясцілі яго выконваючым абавязкі прэзідэнта. У той жа час, як адзначалася ў паведамленні, улада ў краіне была перададзена галоўнакамандуючаму ўзброенымі сіламі генералу Мін Аун Хлаіну. Як паведаміла інфармагенцтва «Сіньхуа», армія ўзяла пад кантроль розныя дзяржаўныя ведамствы, а таксама органы выканаўчай і заканадаўчай улады як у сталіцы краіны, так і ў асобных рэгіёнах М'янмы. Ваенныя ўтрымліваюць парламентарыяў у дэпутацкай рэзідэнцыі ў сталіцы краіны Найп'іда, паведаміла Reuters. У краіне з перабоямі працуе інтэрнэт, адключаны дзяржаўныя тэлеканалы.

ААЭ ўпершыню дадуць замежнікам магчымасць атрымаць грамадзянства

Улады Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў прынялі папраўкі ў закон, якія дазволяць асобным катэгорыям замежнікаў атрымаць грамадзянства краіны. Пра гэта паведаміла дзяржаўнае агенцтва WAM. Па яго даных, прэтэндаваць на атрыманне грамадзянства змогуць інвестары, урачы, спецыялісты, вынаходнікі, навукоўцы, мастакі і члены іх сем'яў. Заявы прэтэндэнтаў на пашпарт ААЭ будуць разглядацца ўрадам і мясцовымі ўпраўленнямі выканаўчай улады. «Новая пастанова накіравана на прыцягненне таленавітых людзей, якія будуць спрыяць нашаму развіццю», — заявіў прэм'ер-міністр ААЭ шэйх Махамед ібн Рашыд Аль Мактум на сваёй старонцы ў Twitter. Паводле інфармацыі WAM, для атрымання грамадзянства Эміратаў неабходна выканаць шэраг умоў. Як адзначыла Bloomberg, ААЭ — першая з краін Персідскага заліва, якая фармалізавала працэс выдачы грамадзянства замежнікам. Раней такая магчымасць давалася толькі ў выключных выпадках.



Кадры

НОВЫ КІРАЎНІК БРЭСТЧЫНЫ

Пазачарговая сесія абласнога Савета зацвердзіла прызначэнне старшыні Брэсцкага аблвыканкама Юрыя ШУЛЕЙКІ

На мінулым тыдні кіраўніком дзяржавы старшынёй Брэсцкага аблвыканкама быў прызначаны Юрый Шулейка. Дэпутатам аблсавета на зацвярджэнне кандыдатуру Юрыя Шулейкі прадставіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар СЕРГЕЕНКА. У сваёй прамове ён нагадаў асноўныя вехі біяграфіі Юрыя Шулейкі, ахарактарызаваў яго як «чалавека ад зямлі, які добрасумленнай працай шмат чаго змог дабіцца ў жыцці».

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Адзначалася, што падчас работы на пасадзе памочніка Прэзідэнта па Гомельскай вобласці з мая 2017 года Юрый Вітольдавіч змог даволі хутка ўнікнуць у асаблівасці работы прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сацыяльнай сферы рэгіёна, асвоіў спецыфіку рэгіянальнай кадравай палітыкі, практыкуе некабінетны стыль работы, патрабавальна і справядліва ставіцца да кадраў.

— Чалавек падрыхтаваны, прайшоў добрую школу кіравання. Упэўнены, што без страты часу зможа ўнікнуць у курс спраў і прыняць на сябе кіраўніцтва вобласцю, якая ўяўляе сабой рэгіён, адзін з тых у краіне, што развіваецца найбольш дынамічна, — сказаў, звяртаючыся да дэпутатаў, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар Сергеенка таксама выказаўся наконт дасягненняў Брэсцкай вобласці і акрэсліў кола праблемных пытанняў, над якімі ў першую чаргу давядзецца працаваць новаму кіраўніку і яго камандзе. Адзначалася, што 20 працэнтаў валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі выпускаецца ў Брэсцкай вобласці. Рэгіён з'яўляецца лідарам у будаўнічай галіне, тут знаходзяцца найлепшыя прадпрыемствы перапрацоўчай прамысловасці. Прадукцыя з вобласці экспартуецца больш чым у сто краін свету. Цяпер на парадку дня стаяць пытанні павышэння эфектыўнасці сельгасвытворчасці, тэхнічнага пераазнашчэння прамысловых прадпрыемстваў, укаранення інавацыйных тэхналогій, паляпшэння лагістыкі і шэраг іншых задач.

На пасяджэнні сесіі слова ўзялі некалькі дэпутатаў аблсавета, якія па рабоце кантактавалі з Юрыем Шулейкам у пару яго работы на розных прадпрыемствах Гродзенскага рэгіёна. Іх ацэнка новага кіраўніка была станоўчай. Пасля такога прадстаўлення дэпутаты Брэсцкага абласнога Савета аднадушна зацвердзілі Юрыя Шулейку старшынёй Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта.

Новы старшыня падзякаваў за падтрымку, згадаў, як у яго бытнасць кіраўніком «Гроднамясамалпрама» раней працавалі па-суседску брэсцкія і гродзенскія перапрацоўшчыкі сельгаспрадукцыі, вырашалі падобныя задачы, і ў многім, на яго погляд, рэгіёны-суседзі падобныя. Пра сябе ён сказаў, што любіць сумленнасць, праўду, не церпіць падхалімства, а ранейшы вопыт на розных кіруючых пасадах дае магчымасць спадзявацца, што з новым адказным участкам работы ён справіцца, цалкам гатовы працаваць на карысць дзяржавы і рэгіёна, вырашаць задачы, пастаўленыя перад вобласцю.

Пазней, у сваім першым на новай пасадзе кароткім інтэрв'ю журналістам, Юрый Шулейка адзначыў, што пачне работу губернатара са знаёмства з вобласцю, найперш наведае Баранавічы, Пінск, праблемныя прадпрыемствы і сельгасарганізацыі.

У канцы пасяджэння сесіі дэпутаты і прысутныя падзякавалі за работу ранейшаму кіраўніку аблвыканкама Анатолю ЛІСУ. Старшыня абласнога Савета Юрый НАРКЕВІЧ уручыў экс-губернатару Ганаровую грамату абласнога Савета і пажадаў поспехаў на новым участку работы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Надвор'е

Слабая мяцеліца, пры праясненнях да мінус 18

А ў першыя выхадныя лютага будзе яшчэ халадней

Як нам запомніўся студзень? Так, гэта быў месяц кантрастаў, калі спачатку цэлы тыдзень стаялі траскучыя маразы, а потым чаргаваліся з адлігамі і анамальна высокімі тэмпературамі. У цэлым, другі месяц зімы, хоць і запомніўся добрым снегам, але тэмпературны фон яго ўсё ж быў на 1 градус вышэйшы за кліматычную норму. А ападкаў на большай частцы краіны выпала ад 1,5 да 2 месячных нормаў, месцамі сума ападкаў перавышала норму студзеня ў два з паловай разы.

Першы тыдзень лютага таксама будзе пераменлівы. На фоне марознага надвор'я на старце тыдня да яго сярэдзіны чакаецца кароткачасовае пацяпленне. А ў канцы тыдня зноў пахаладае, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень па паўночна-заходняй частцы краіны пройдзе невялікі снег. На асобных участках дарог будзе галалёдзіца. Вецер паўднёвы, паўднёва-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўдзень будзе мінус 3—9 градусаў, на паўднёвым захадзе — ад мінус 2 градусаў да 1 цяпла.

Часовая адліга прыйдзе да нас заўтра. У гэты дзень часам пройдзе снег, месцамі мокры снег і нават дождж. У асобных раёнах туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёвы, удзень з пераходам на заходні ўмераны. Уначы чакаецца ад нуля па паўднёвым захадзе да мінус 10 па ўсходзе краіны, удзень будзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 5 градусаў.

Дзіўнае надвор'е чакае нас і ў чацвер. Так, 4 лютага часам чакаюцца снег, мокры снег, па поўдні — з дажджом. Месцамі туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер пераменных напрамкаў умераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра на працягу сутак пераважна па паўднёвай частцы краіны складзе ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла, у паўночных раёнах — 5—9 марозу, уначы па Віцебскай вобласці пры праясненнях да мінус 12 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу месцамі, у асноўным па паўднёвым усходзе, чакаюцца кароткачасовы снег, слабая завіруха. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы будзе 10—15 марозу, пры праясненнях — да мінус 18 градусаў, удзень прагназуецца ад мінус 6 градусаў да 13 марозу. У паўднёвых рэгіёнах нашай краіны ўначы будзе 7—9 марозу, удзень — ад мінус 4 градусаў да мінус 5. Зімовы характар надвор'я захаваецца і ў выхадныя дні, калі чакаецца ўзмацненне маразоў. Нічога асаблівага — на тое ён і люты.

Сяргей КУРКАЧ.

На слыху

БАЛЬНІЦЫ ВЯРТАЮЦЦА ДА ЗВЫКЛАГА РЭЖЫМУ

Міністэрства аховы здароўя прыняло рашэнне аб далейшым перапрафіляванні бальніц. Маніторынг паказвае, што эпідэмічная сітуацыя дазваляе пераводзіць іх у звыклы рэжым работы. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе ведамства.

Таксама вырашана пашыраць планавую дапамогу, у тым ліку ў паліклініках. Будуць прынятыя меры па ўзмацненні захавання сацыяльнага дыстанцыявання, у тым ліку ў месцах масавага знаходжання, у калектывах, месцах гандлю і грамадскага харчавання. Працягнецца эпідэмічны маніторынг з мэтай адсочвання штамаў.

Пры гэтым міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч паставіў задачу інтэнсіфікаваць прышчэпачны працэс супраць каранавіруса і актуалізаваць графікі пастаўкі лекаў. Дарэчы, маніторынг паказаў, што медустановы забяспечаны лекамі і сродкамі індывідуальнай аховы. Створаны іх запас дазваляе забяспечыць работу арганізацый аховы здароўя ў сярэднім на працягу больш чым двух месяцаў. Спецыялісты працягваюць работу па далейшым набыцці неабходнага высокатэхналагічнага абсталявання і лекавых сродкаў.

У Брэсцкай вобласці праведзена дэзынфекцыя тэрапеўтычнага аддзялення Іванаўскай ЦРБ. Цяпер уся цэнтральная раённая бальніца працуе ў звычайным рэжыме. Плануецца, што з 2 лютага вернуцца да звыклай работы Столінская і Драгічынская ЦРБ. Чакаецца пераход на работу ў планавым рэжыме і ўсёй Ляхавіцкай цэнтральнай раённай бальніцы.

З 29 студзеня прымае пацыентаў па профілі Віцебская гарадская цэнтральная клінічная бальніца, а з 3 лютага прыступіць да работы ў звычайным рэжыме Віцебская гарадская цэнтральная клінічная бальніца № 1.

У Гродзенскай вобласці ў апошнія дні студзеня перайшлі на работу ў звычайным рэжыме кардыялагічнае аддзяленне ЦРБ у Лідзе, кардыялагічнае аддзяленне ў Навагрудскай ЦРБ, аддзяленне паталогіі цяжарнасці і хірургічнае аддзяленне ў Дзятлаўскай бальніцы, а таксама хірургічнае аддзяленне ў Ашмянскай ЦРБ. Прымаюць пацыентаў без COVID-19 спецыялісты педыятрычнага аддзялення Карэліцкай ЦРБ, тэрапеўтычнага аддзялення Свіслацкай ЦРБ, а таксама частка аддзялення Іўеўскай ЦРБ.

Фота БелТА.

У Мінскай гарадской клінічнай бальніцы № 1.

У звычайным рэжыме з 29 студзеня працуе Гомельская гарадская клінічная бальніца. З канца мінулага тыдня адкрыты тэрапеўтычныя аддзяленні ў Рэчыцкай і Ельскай цэнтральных раённых бальніцах. Акрамя таго, прымаюць профільных пацыентаў спецыялісты ў аддзяленнях педыятрыі, рэабілітацыі і неўралогіі ў Жлобінскай ЦРБ. Адкрыта таксама кардыялагічнае аддзяленне ў Мазырскай цэнтральнай гарадской паліклініцы. З 1 лютага пачнуць прымаць профільных пацыентаў неўралагічнае і тэрапеўтычнае аддзяленні Веткаўскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Аналагічная сітуацыя і ў Мінскай вобласці. З 1 лютага пачынае прыём пацыентаў у планавым рэжыме Атолінская бальніца і тэрапеўтычны корпус Мар'інагорскай цэнтральнай раённай бальніцы. Мінскі абласны цэнтр медыцынскай рэабілітацыі і Жодзінская цэнтральная гарадская бальніца з 1 лютага стануць прымаць пацыентаў кардыялагічнага профілю. Барысаўская цэнтральная раённая бальніца правяла дэзынфекцыю і гатовая з 1 лютага прымаць пацыентаў отарыналарынгалагічнага профілю.

У сталіцы з 1 лютага прымае пацыентаў па профілі гарадская клінічная бальніца № 1. Пачынае работу ў звычайным рэжыме і тэрапеўтычны корпус бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

З канца мінулага тыдня адкрыта для профільных пацыентаў кардыялагічнае аддзяленне Магілёўскай абласной клінічнай бальніцы. Вяртаецца да работы ў звычайным рэжыме фтызіятрычнае аддзяленне Магілёўскага абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансера. У планах да 8 лютага правесці поўную дэзынфекцыю і адкрыць для пацыентаў гематалагічнае аддзяленне ў Магілёўскай абласной клінічнай бальніцы і артапедычнае аддзяленне ў Магілёўскай бальніцы № 1.

Алена КРАВЕЦ.

У цэнтры ўвагі

АДКРЫТАЯ РАЗМОВА АБ ПЕРСПЕКТЫВАХ СТАЛІЦЫ

У гарадскім палацы культуры адбылася сустрэча ўдзельнікаў VI Усебеларускага народнага сходу ад Мінска. Мэта форуму — абмеркаваць асноўныя кірункі развіцця краіны і яе сталіцы на будучую пяцігодку.

ПУНКТЫ РОСТУ

Якасць і выніковасць дыскусіі ў значнай ступені залежаць ад падрыхтаванасці яе ўдзельнікаў. Спіс мінскай дэлегацыі на Усебеларускі народны сход сведчыць аб імкненні гараджан найбольш поўна прадставіць розныя слаі насельніцтва беларускай сталіцы ў абмеркаванні праблем і пытанняў, якія хвалююць яе жыхароў. Нагадаем, дэлегатамі сходу ад Мінска абраны 366 чалавек, у тым ліку 55 дэпутатаў гарадскога Савета дэпутатаў.

У рабоце гарадскога сходу акрамя дэлегатаў таксама ўдзельнічалі парламентарыі, якія былі абраныя мінчанамі: дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, кіраўнікі мясцовых органаў выканаўчай улады. Да размовы таксама былі запрошаны прадстаўнікі прафсаюзных і грамадскіх арганізацый. Напрыклад, Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, Белай Русі, БРСМ, Беларускага саюза жанчын.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА пажадала дэлегатам плённай работы ў гэтым важным грамадска-палітычным мерапрыемстве ў жыцці краіны. Паводле яе слоў, цікавасць да VI Усебеларускага народнага сходу вельмі вялікая, прапаноў па розных кірунках развіцця краіны паступіла вельмі шмат. Спікер верхняй палаты парламента выказала ўпэўненасць у тым, што на сходзе дэлегатаў чакае цікавая дзелавая размова.

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ паведаміў аб выніках работы сталіцы за мінулае пяцігоддзе і акрэсліў задачы на будучую пяцігодку. Старшыня назваў галоўныя пункты росту эканомікі Мінска. Калі задуманае атрымаецца рэалізаваць, то ў 2025 годзе чакаецца істотны прырост эканамічных паказчыкаў. Прыярытэтнымі кірункамі, якія забяспечаць устойлівую дынаміку развіцця сталіцы, стануць лічбавая трансфармацыя эканомікі, правядзенне актыўнай інвестыцыйнай палітыкі.

У сталіцы працягнуць рэалізацыю комплекснай лічбавай трансфармацыі інфраструктуры ў рамках праграмы «Разумны горад». Да канца пяцігодкі мяркуецца ўкараніць інавацыйныя рашэнні па кіраванні гарадской інфраструктурай, напрыклад на транспарце. Гэта дазволіць збіраць і апрацоўваць вялікія масівы даных, аналіз якіх дасць магчымасць прагназаваць «паводзіны» асобных аб'ектаў інфраструктуры, прадухіляць небяспечныя сітуацыі, аказваць жыхарам і гасцям горада шматлікія паслугі, павышаць камфорт іх жыцця. У прыватнасці, прадугледжваецца ўкараненне сістэмы маніторынгу пасажырапатоку на транспарце з мэтай знізіць эксплуатацыйныя выдаткі за кошт рацыянальнага выкарыстання рухомага саставу.

У Мінску ў гэтай пяцігодцы акцэнт будзе зроблены на стварэнні і пашырэнні інавацыйных вытворчасцяў электратранспарту, у тым ліку беспілотнага, выпуску шырокай гамы прадукцыі прыборабудавання і электронікі, оптыкі, лазернай і цеплавізійнай тэхнікі, новых матэрыялаў і пакрыццяў. Запланавана будаўніцтва новага корпуса ААТ «МАЗ», што дазволіць павялічыць вытворчасць аўтобусаў у тры разы. Далейшае развіццё атрымае Мінскі гарадскі тэхнапарк, дзе колькасць рэзідэнтаў да 2025 года павялічыцца з 40 да 80.

Сфера медыцыны. На думку Уладзіміра Кухарава, укараненне лічбавых тэхналогій у сістэме аховы здароўя ў рамках рэалізацыі праектаў «Разумная паліклініка», «Разумная бальніца» і «Разумная хуткая медыцынская дапамога» дапаможа ажыццяўляць аператыўны паўнавартасны абмен медыцынскімі данымі за кошт падключэння да карпаратыўных медыцынскіх сістэм і сэрвісаў. Старшыня гарвыканкама паведаміў пра планы будаўніцтва ў Мінску аб'ектаў аховы здароўя, а гэта сем паліклінік і шэсць стацыянараў, стварэнне новага корпуса трансплантацыі касцявога мозгу і ствалавых клетак на базе Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі.

Калі быць дакладным, то чатыры дзіцячыя паліклінікі з'явяцца ў мікрараёнах Сухарава-3, Лошыца-9, «Мінск-Мір». Таксама пабудуюць новы будынак 9-й дзіцячай паліклінікі. У планах дзве дарослыя паліклінікі — у «Мінск Міры» і новы будынак 15-й гарадской паліклінікі, а таксама амбулаторыя для дарослых пацыентаў у раёне Сокал.

ЗАСЯРОДЖАНАСЦЬ НА ГАЛОЎНЫМ

Удзельнікам гэтай сустрэчы трэба было выпрацаваць сваё бачанне курсу развіцця краіны на пяцігодку, вызначыць і прапанаваць свае падыходы Усебеларускаму народнаму сходу па змесце і наступнай рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на новую пяцігодку. Пра яе ключавыя палажэнні расказаў прысутным **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ.** Ён зрабіў акцэнт на значнай, можна сказаць асаблівай ролі сталіцы ў ажыццяўленні планаў і праектаў Праграмы. Дарэчы, у рабоце сходу ўдзельнічалі і іншыя кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання: **міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй ХМЕЛЬ.**

Літаральна ў выступленні кожнага дэлегата чуўся клопат пра будучыню краіны. **Генеральны дырэктар МАЗа Валерый ІВАНКОВІЧ** казаў пра неабходнасць удасканалення экспартнай палітыкі, перавагу стварэння зборачных вытворчасцяў у розных краінах, развіццё галіновай навукі як перспектыўнага пункту росту, пра абвастрэнне канкурэнтнай барацьбы з замежнымі вытворцамі, пра якасць кадраў, падрыхтоўку якіх варта весці ў цесным спалучэнні адукацыі і рэальнай вытворчасці.

Рэктар БНТУ Сяргей ХАРЫТОНЧЫК развіў тэму эфектыўнага выкарыстання чалавечага патэнцыялу краіны, спыніўся на шляхах павышэння практыка-арыентаванасці ў вышэйшай адукацыі, у прыватнасці, далейшага ўзаемадзеяння ўніверсітэтаў і вытворчасці, стварэння з гэтай мэтай філіялаў кафедраў на вядомых прадпрыемствах. Аднак у заканадаўстве адсутнічае паняцце «філіял кафедры», што замінае падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў для прамысловасці. Гэты недахоп трэба выправіць.

Старшыня савета камуністычнай партыі Беларусі Аляксей КАМАЙ звярнуў увагу на неабходнасць узмацнення работы сярод юнакоў і дзяўчат, на тое, што рабіць стаўку трэба на іх патрыятычнае і працоўнае выхаванне, напрыклад у студэнцкіх будаўнічых атрадах. Лідар камуністаў таксама падверг крытыцы махляроў у сферы эканомікі, якіх трэба вывесці на чыстую ваду.

Спецыяліст па маркетынгу Беларускага Дома друку, актывіст БРСМ Антон ПАВЕЛЬЕЎ прапанаваў абмеркаваць на сходзе мэтазгоднасць стварэння Дзяржаўнага камітэта па справах моладзі, павысіць узрост маладога чалавека да 35 гадоў.

Прысутныя з цікавасцю ўспрымалі і іншых прамоўцаў, выступленні якіх былі не толькі пра эканоміку і «сацыялку», а і пра палітыку, новыя законы, сутнасць патрыятызму, выхаванне моладзі, сродкі масавай інфармацыі і г. д. Нечакана прагучала выступленне ганаровага грамадзяніна Мінска, **пісьменніка Мікалая ЧАРГІНЦА.** Ён заклікаў дэлегатаў павесці на шостым сходзе размову і пра літаратуру, пра небяспеку скарачэння бібліятэк у рэгіёнах, пра актуальнасць стварэння ў сталіцы паўнавартаснага Парку пісьменнікаў, дзе можна было б праводзіць розныя карысныя мерапрыемствы, у тым ліку і з маладзёжнай аўдыторыяй.

Дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук Белдзяржуніверсітэта Вадзім ГІГІН казаў пра неабходнасць зрабіць правільныя высновы з палітычнага крызісу, які краіна перажыла летась. Крызіс павінен нас навучыць, як жыць надалей.

Старшыня праўлення Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ заклікаў дэлегатаў аддаваць самую пільную ўвагу медыявымярэнню, без чаго нельга належным чынам паказваць дасягненні краіны.

Дырэктар мінскай гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны Наталля БУШНАЯ гаварыла слушныя рэчы наконт таго, што сёння важна моладзь навучыць думаць. А гэта немагчыма без удасканалення сістэмы адукацыі.

У завяршэнні размовы мінскія дэлегаты прынялі рэзалюцыю, у якой акцэнтавалі ўвагу на неабходнасці павышэння дабрабыту і якасці жыцця кожнага чалавека, забеспячэння стабільнасці, міру і парадку ў краіне. Дэлегаты таксама падтрымалі ключавыя палажэнні Праграмы яе сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады і абавязаліся ініцыяваць актыўнае абмеркаванне ў працоўных калектывах рашэнняў Усебеларускага народнага сходу і арганізаваць іх рэалізацыю ў практыцы дзяржаўнага будаўніцтва і грамадскага развіцця.

Леанід ТУГАРЫН.

Фота БелТА.

Слова — дэлегатам

«Усенародны грамадскі дыялог недаацэньваць нельга»

Галоўная мэта такога маштабнага форуму, як Усебеларускі народны сход, сцвярджае старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Людміла КАНАНОВІЧ, — абмеркаваць актуальныя пытанні жыцця грамадства, разгледзець іх на агульнарэспубліканскім узроўні, выпрацаваць шляхі рашэння.

Людміла Мікалаеўна ўспамінае, што на Усебеларускім народным сходзе ў 2016 годзе яе абралі дэлегатам ад Мінскай вобласці, і гэта было знакам вялікай пашаны і даверу. «Прадстаўніцтва ўдзельнікаў на мінулым форуме было максімальна разнастайнае, і я ўпэўненая, што гэтую практыку трэба працягнуць і пры абранні дэлегатаў на чарговы сход. Вельмі важна, каб былі прадстаўлены розныя ўзроставыя, сацыяльныя, прафесійныя і нацыянальныя групы: моладзь, ветэраны, вясковыя жыхары, прадстаўнікі рабочых прафесій і органаў улады», — кажа дэпутат.

Парламентарый пералічыла, якім аспектам мяркуе ўдзяліць на форуме асаблівую ўвагу — павышэнне даходаў, праблемы пенсіянераў, сацыяльная абарона і абслугоўванне, занятасць, падтрымка сям'і.

«Уважлівае стаўленне да старэйшых — характэрная рыса беларускага менталітэту. Дзяржава клапоціцца аб такой катэгорыі грамадзян, — заўважае суразмоўніца. — І тут адной з задач з'яўлялася і будзе з'яўляцца падтрымка ўзроўню пенсій непрацаздольных грамадзян і забеспячэнне своечасовасці і паўнаты выплат».

Дынамічна развіваецца і ўдасканальваецца, адзначае Людміла Кананоўіч, падтрымка малазабяспечаных грамадзян і тых, што знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Гэтым пытанням таксама плануецца ўдзяліць увагу на Усебеларускім народным сходзе.

«У плане занятасці грамадзян шмат зроблена для павышэння канкурэнтаздольнасці беспрацоўных праз іх навучанне. Зарэгістраваныя ў дзяржаўнай службе занятасці беспрацоўныя маюць магчымасць атрымаць новую прафесію, павысіць кваліфікацыю, навучыцца асновам прадпрымальніцтва і ўзяць фінансавую дапамогу для адкрыцця ўласнага бізнесу. Такая сістэма будзе развівацца і далей», — заўважае Людміла Кананоўіч.

Паводле слоў дэпутата, падтрымка сям'і — яшчэ адна актуальная задача беларускай дзяржавы, якой чарговы раз аддадуць увагу на народным форуме.

«Вельмі шмат у гэты перыяд паступае зваротаў грамадзян з прапановамі па ўдасканаленні заканадаўства па розных кірунках жыццядзейнасці нашай краіны. Нам, дэпутатам, важна пачуць, што сёння асабліва турбуе людзей, якой яны хочуць бачыць нашу краіну ў будучыні. З такой мэтай па ўсёй краіне праходзяць сустрэчы з насельніцтвам у форме дыялогавых пляцовак. Гэты ўсенародны грамадскі дыялог недаацэньваць нельга», — рэзюмуе парламентарый.

На мэце — пабудова інтэлектуальнай краіны

ПРЫЦЯГНЕННЕ ІНВЕСТАРАЎ

— Праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады — гэта комплексны і сістэмны дакумент, які ўлічвае нацыянальныя інтарэсы краіны. Ён вылучаецца канкрэтнасцю, мэтавым характарам, а таксама навізной у структураванні і выкладанні, — падкрэсліў Васіль Гурскі. — У ім улічаны прыярытэты беларускай эканамічнай мадэлі, а ў цэнтры ўвагі знаходзіцца паляпшэнне якасці жыцця насельніцтва. Дакумент вызначае мэты, ключавыя задачы і прыярытэты развіцця краіны на найбліжэйшую пяцігодку.

Значная ўвага ў праекце праграмы аддадзена пытанням комплекснага ўдасканалення інвестыцыйнай і інавацыйнай палітыкі ў наступнай пяцігодцы. Пры гэтым акцэнт робіцца не столькі на нарошчванні аб'ёмаў інвестыцый, колькі на павышэнні эфектыўнасці інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці і прыцягненні інвестыцый у стварэнне высокатэхналагічных вытворчасцяў, што будзе спрыяць устойлівому росту нацыянальнай эканомікі. Праграмай прадугледжваецца ўкараненне новых інвестыцыйных механізмаў, у прыватнасці, прапанавана ўкараненне прававога рэжыму спецыяльных інвестыцыйных дагавораў з мэтай стымулявання ўкладання інвестыцый у эканоміку Беларусі.

Са станоўчага боку можна ацаніць замацаваныя ў Праграме палажэнні адносна гарантавання правоў на разумную рызыку навукоўцам, якія працуюць над стварэннем новай навукова-тэхналагічнай прадукцыі з прыцягненнем бюджэтных сродкаў

Праграмай таксама прадугледжана ўвядзенне інстытута «стабілізацыйнай агаворкі». Гэты інструмент з'яўляецца дзейснай мерай у прыцягненні стратэгічных інвестараў, нацэленых менавіта на доўгатэрміновае супрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь. Увядзенне такой «агаворкі» дазволіць абараніць інтарэсы інвестара ў выпадку змяненняў у заканадаўстве, якія могуць пагоршыць яго становішча,

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

на працягу ўсяго інвестыцыйнага перыяду.

ПРАВА НА РАЗУМНУЮ РЫЗЫКУ

Як адзначыў дырэктар Інстытута эканомікі НАН, Праграма накіравана на стварэнне сучаснай экасістэмы інавацый на аснове рэалізацыі інтэлектуальнага патэнцыялу Беларусі. Для гэтага распрацаваны цэлы комплекс мер, накіраваных на фарміраванне і развіццё высокатэхналагічнага сектара эканомікі, удасканаленне сістэмы фінансавання навукова-тэхналагічнай і інавацыйнай дзейнасці, фарміраванне паўнавартаснага канкурэнтнага асяроддзя ў навукова-інавацыйнай сферы і стварэнне сучаснай інфраструктуры.

Найважнейшай арганізацыйна-эканамічнай інавацыяй можа стаць фарміраванне адзінай карпаратыўнай сістэмы кіравання рэальным сектарам з выкарыстаннем комплексных ІТ-рашэнняў. Стварэнне агульнанацыянальнага інфармацыйнага рэсурсу, які забяспечвае збор, апрацоўку, захоўванне і абмен данымі аб наяўнасці сыравіны, матэрыялаў, камплектуючых, а таксама складскіх запасаў гатовай прадукцыі з мэтай аптымізацыі іх патокаў, дазволіць істотна павысіць эфектыўнасць інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці. У праекце праграмы асаблівая ўвага аддаецца прыцягненню інвестыцый у пабудову лічбавай эканомікі і развіццю яе інфраструктуры. Праграма нацэлена на шырокамаштабнае ўкараненне ІКТ ва ўсе сферы нацыянальнай эканомікі і істотны рост долі лічбавай эканомікі ў ВУП краіны.

Асноўныя намаганні будуць накіраваны на арганізацыю лічбавага інфармацыйнага асяроддзя, фарміраванне інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры, падрыхтоўку кадраў і стварэнне лічбавых платформаў.

Найважнейшым фактарам развіцця інавацыйнага асяроддзя з'яўляецца нарошчванне патэнцыялу галіновай навукі.

— У гэтым кантэксце са станоўчага боку можна ацаніць замацаваныя ў Праграме палажэнні адносна гарантавання правоў на разумную рызыку навукоўцам, якія працуюць над стварэннем новай навукова-тэхналагічнай прадукцыі з прыцягненнем бюджэтных сродкаў. Як вядома, у апошнія гады бюджэты многіх інвестыцыйных інавацыйных фондаў не выкарыстоўваліся цалкам з-за высокага ўзроўню рызыкі і звязанай з гэтым адказнасці, — падкрэсліў Васіль Гурскі. — Забеспячэнне права на разумную рызыку мае на ўвазе замацаванне ў нацыянальным заканадаўстве норм, якія ствараюць збалансаваныя суадносіны паміж рызыкамі і адказнасцю для навукоўцаў пры выкананні імі прыкладных даследаванняў і распрацовак у рамках навукова-тэхнічных праграм і інавацыйных праектаў.

У Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця плануецца ўкараніць венчурную экасістэму з улікам найлепшых міжнародных практык і прынцыпаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Плануецца, што на працягу пяці гадоў навукаёмістасць ВУП вырасце да аднаго працэнта.

Гэта шмат у чым будзе забяспечана за кошт сістэмнага ўдасканалення фінансавання навукова тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, а таксама выдзялення мэтавай фінансавай падтрымкі па комплексных праектах для стварэння новых прарыўных вытворчасцяў, у тым ліку ў рамках праектаў будучыні, а гэта нацыянальны электратранспарт, біятэхналогіі ў аграпрамысловым комплексе, інавацыйная медыцына, біятэхналогіі для фармацэўтыкі і «разумныя гарады».

УСТОЙЛІВАСЦЬ ДА ЗНЕШНІХ ШОКАЎ

— Акадэмія навук вельмі актыўна ўдзельнічала ў рабоце над Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця.У цэлым трэба сказаць, што праграма захоўвае пераемнасць з дакументамі падобнага роду, якія распрацоўваліся на працягу ўсёй гісторыі суверэннай Беларусі, — падкрэсліў у сваім выступленні **дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Валерый ГАНЧАРОЎ.** — Для нас, навукоўцаў, найбольшы інтарэс уяўляе падраздзел, прысвечаны інтэлектуальнай краіне. Мы яшчэ ў 2017 годзе распрацавалі і адобрылі на ІІ з'ездзе беларускіх вучоных Стратэгію «Навука і тэхналогіі: 201–2040». Па сутнасці, галоўны кантэкст пабудовы Беларусі інтэлектуальнай быў закладзены яшчэ ў той перыяд.

— А я хацеў бы падзяліцца сваім меркаваннем з нагоды тых механізмаў і інструментарыя, якія мы маглі б узяць на ўзбраенне ў дапаўненне да асноўных, выкладзеных у Праграме. Перш за ўсё, **бягучы год — гэта Год народнага адзінства. На мой погляд, лагічна было б пашырыць гэтае разуменне на ўсю эканамічную сістэму, гэта значыць, аб'яднаць намаганні не проста ў рамках праграмных мерапрыемстваў, але і намаганні ўсіх міністэрстваў, канцэрнаў, буйных прадпрыемстваў па дасягненні агульнай мэты — росту ўнутранага валавога прадукту і на гэтай аснове — дабрабыту народа.**

Наш вопыт работы з галінамі, з буйнымі канцэрнамі сведчыць, што аб'яднанне намаганняў эканамічных суб'ектаў настойліва неабходнае, таму што часта галіны замыкаюцца ў рамках свайго прадукту, лічачы яго канчатковым, хоць, з пункту гледжання макраэканомікі, гэта прадукт прамежкавага спажывання. Выходзячы з гэтага, нам патрэбная гарманізацыя ўсіх відаў палітыкі: найперш інвестыцыйнай, інавацыйнай, знешнегандлёвай і прамысловай. Чаму гэта неабходна? Мы бачым узмацненне глабальнай нестабільнасці, бачым, што ўзрушэнні як эканамічнага, так і тэхнагеннага характару могуць сказіць аблічча існуючай эканамічнай сістэмы. Далёка хадзіць не трэба — мы бачым, як пандэмія каранавіруса прывяла да таго, што спыніліся цэлыя галіны, шэраг ланцужкоў, што склаліся, быў парушаны. Таму нам трэба распрацоўваць сваю беларускую палітыку, я яе назваў бы палітыкай устойлівасці да знешніх шокаў. Мы павінны працаваць на апярэджанне. Валерый Ганчароў падкрэсліў: прэвентыўная сістэма павінна быць настроена на работу незалежна ад таго, якія нас чакаюць пагрозы і выклікі. Палітыка ўстойлівасці да знешніх шокаў павінна ўключаць компекс прэвентыўных мер, прычым, павінен быць забяспечаны гарантаваны ўзровень вытворчасці ў тых ключавых галінах, якія дазваляюць нам выжыць пры любых праявах знешняга ціску.

ГАЛОЎНАЯ ПЕРАВАГА — ЯКАСЦЬ

Нават сама аўтэнтычнасць беларускага народа, на думку Валерыя Ганчарова, з'яўляецца фактарам нашай канкурэнтаздольнасці:

— Развіваючы пытанне кампетэнцый, трэба сказаць, што галоўнай нашай кампетэнцыяй з'яўляецца гарантаваная якасць. Беларусі як аўтэнтычнаму нацыянальнаму ўтварэнню ўласцівы самы высокі якасны ўзровень — непаўторны больш нідзе ў свеце. Так, гэта складана, але менавіта тут могуць хавацца пункты росту для беларускай эканомікі.

Галоўнае, што ў цэнтры ўсіх нашых праграмных дакументаў стаіць Чалавек з вялікай літары, які актыўна працуе на сябе, на сваіх блізкіх і на краіну, пераўтвараючы эканоміку. Я перакананы, што трэба пачынаць з сябе, трэба ўкладваць свае інтэлект, веды, уменні, фізічныя рэсурсы ў тую справу, якой ты аддаены. І, трэба прызнаць, што беларусы новай фармацыі не з'явяцца зніадкуль. Мы павінны іх выхоўваць у сабе. Цяпер у свеце працягваецца бурнае абмеркаванне кампетэнцый будучыні, якія прафесіі будуць патрэбныя, а якія знікнуць з рынку працы. Прычым меркаванні экспертаў разыходзяцца.

Хутчэй за ўсё, мы павінны казаць аб праактыўнай палітыцы ў фарміраванні нашых кампетэнцый будучага, нашага вытворчага патэнцыялу. Як паказваюць даследаванні, расце запатрабаванасць спецыялістаў, гатовых вырашаць нетрывіяльныя задачы, атрымліваць новыя прадукты, тавары і паслугі. Наша задача — прымусіць штучны інтэлект, вылічальныя машыны і сеткі працаваць на чалавека, дазволіць раскрыцца яго патэнцыялу, тым самым мы створым пачатак для новага развіцця.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Супрацоўніцтва

СФЕРА ІНТАРЭСАЎ — КОСМАС

У Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў рэжыме відэаканферэнцыі адбылося другое пасяджэнне Міждзяржаўнага савета па космасе дзяржаў — удзельніц СНД.

Як адзначыў **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ,** адным з прыярытэтных кірункаў міждзяржаўнага ўзаемадзеяння ў рамках СНД было і застаецца супрацоўніцтва ў галіне мірнага асваення космасу, і пацвярджэнне таму — прыняцце ў 2018 годзе новай нарматыўнай базы, якая рэгламентуе сумесную дзейнасць дзяржаў — удзельніц СНД у касмічнай сферы і стварэнне ў студзені 2020 года Міждзяржаўнага савета па космасе. Беларусь мела гонар старшынстваваць у Савеце на працягу першага года яго дзейнасці, па выніках якога можна з упэўненасцю канстатаваць, што рашэнне аб яго стварэнні было правільнае, своечасовае і адпавядае рэаліям сённяшняга дня.

Уладзімір Гусакоў як старшыня Міждзяржаўнага савета ў 2020 годзе праінфармаваў удзельнікаў пасяджэння аб выніках дзейнасці савета за мінулы год пад старшынствам Рэспублікі Беларусь, а таксама аб далучэнні НАН Беларусі ў студзені бягучага года да Міжнароднай хартыі «Космас і буйныя катастрофы» ў якасці паўнапраўнага члена.

На пасяджэнні былі разгледжаны і прыняты рашэнні аб неабходнасці далейшай распрацоўкі дзяржавамі — удзельніцамі СНД шматмэтавай аэракасмічнай сістэмы прагнознага маніторынгу надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, інтэграцыі наземных інфраструктур дзяржаў — удзельніц СНД, якія выкарыстоўваюць сігналы сістэмы ГЛАНАСС, нарматыўна-тэхнічнага забеспячэння сумесных праектаў у сферы касмічнай дзейнасці, прадстаўлены прэзентацыі аб дасягнутых выніках у галіне касмічнай дзейнасці.

Міждзяржаўным саветам падтрымана прапанова Расійскай Федэрацыі аб практычным развіцці супрацоўніцтва ў сферы аказання і выкарыстання касмічных паслуг і аб распрацоўцы з гэтай мэтай міждзяржаўнай праграмы. Таксама Саветам прынята рашэнне выпрацаваць адзіную пазіцыю дзяржаў — удзельніц СНД па пытаннях, якія ўваходзяць у парадак дня Камітэта ААН па космасе і яго падкамітэтаў з мэтай агучвання апошняй на пляцоўцы ААН.

У адпаведнасці з Палажэннем аб Міждзяржаўным савеце старшынства ў ім у 2021 годзе перайшло да Рэспублікі Казахстан.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 16 февраля 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: 1. Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества, на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2. Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. 3. Земельный участок под объект продажи **(лот №№ 1, 2, 3)** будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается)		
	Местонахождение лотов: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Информация о земельном участке:** лот № 1–3 расположены на земельном участке с кадастровым номером **3408000000040000100** общей площадью **10,1123 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания производственных зданий завода		
1	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14108** площадью **12 563,1 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **цех металлоконструкций.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, 8/9. **Ограничение (обременение):** договор об ипотеке (ОАО «БПС-Сбербанк», ОАО «Жлобинский механический завод «ДНЕПР») от 24.02.2016 № 320-00002/16-01. Договор о залоге (ипотеке)	**530 400,00**	53 040,00
2	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14071** площадью **139,2 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание склада для хранения легковоспламеняющейся жидкости.** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, 8	**7 320,00**	732,00
3	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14075** площадью **240,9 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное панельное здание компрессорной с кирпичной отапливаемой пристройкой (20 м куб. в минуту).** Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, 8	**13 860,00**	1 386,00
6	Блок контейнер (бытовка), инв. № 61392	**1 050,00**	105,00
7	Барабан для сушки песка, инв. № 61038	**810,00**	81,00
8	Лестница с площадкой для стропальщиков, инв. № 61095	**690,00**	69,00
9	Площадка передвижная для сборки экскаватора, инв. № 61079	**180,00**	18,00
10	Сварочный аппарат ВА-500 MIG/MAG, инв. № 61185	**930,00**	93,00
11	Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61231	**1 050,00**	105,00
12	Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61279	**1 050,00**	105,00
13	Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61280	**1 050,00**	105,00
14	Сварочный аппарат ВА-500.2 MIG/MAG, инв. № 61281	**1 050,00**	105,00
Сведения о земельном участке: пл. **36,8556 га** предоставлен продавцу на праве долевой аренды (доля: 99/100, срок действия по 31.07.2053) для размещения объектов иного назначения. Ограничения (обременения): охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5060 га), теплоснабжения (пл. 0,2500 га), газоснабжения (пл. 0,0430 га). После продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута	
Начальная цена лота с НДС 20 % – 826 200,00 бел. руб. (снижена на 10 %)	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона	
Условия оплаты предмета электронных торгов	
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by	
Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов	
Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 27.11.2020	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона	
Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 18.02.2021 в 13.00. Окончание торгов: 18.02.2021 в 14.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 16.02.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**
Контактные телефоны	**+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (организатор аукциона)

извещает о проведении 5 марта 2021 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь (га)	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена *(бел. рублей)*	Размер задатка *(бел. рублей)*	Затраты на организацию и проведение аукциона *(бел. рублей)*
1	**аг. Гостиловичи, ул. Гайненская, 16, кадастровый номер 623284601601000358,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1120	газификация, электрификация, водоснабжение	8 500,00	850,00	2273,46 + расходы за размещение объявления
2	**д. Понизовье, ул. Руднянская, 3, кадастровый номер 623284604601000149,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1400	электрификация	3 500,00	350,00	1668,65 + расходы за размещение объявления
3	**д. Терховичи, ул. Центральная, 45Б, кадастровый номер 623284605601000063,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1491	водоснабжение, газификация	15 000,00	1500,00	2260,63 + расходы за размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона: 5 марта 2021 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, Логойский сельский исполнительный комитет, контактные. тел.: (801774) 28473, (8029) 1779511.

Прием документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 01.03.2021 г. включительно.

Для участия в аукционе необходимо:

1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;
2. представить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Задаток перечисляется на расчетный счет BY25-AKBB36006191011030000000 БИК AKBB BY 2X г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600537220, код 04901, получатель – Логойский сельский исполнительный комитет.

Условия: аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку», в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

ОЗЕРСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

сообщает о проведении 3 марта 2021 года по адресу: агрогородок Озеро, улица Дзержинская, 27б в 10.00 открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

ЛОТ №	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена, бел. руб.	Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб.	Сумма задатка, бел. руб.
Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома						
1	Минская область, Узденский район, деревня Королёво, улица Первомайская, участок № 6, кадастровый номер 625682506101000285	0,1155	Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги	23 000,00	1681,23 + публикация в газете	2 300,00
2	Минская область, Узденский район, агрогородок Озеро, улица Приозёрная, участок № 18, кадастровый номер 625682508601000955	0,15	Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению. Подъезд с асфальтированной дороги	25 000,00	1606,76 + публикация в газете	2 500,00
3	Минская область, Узденский район, агрогородок Озеро, улица Приозёрная, участок № 16, кадастровый номер 625682508601000954	0,15	Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению. Подъезд с асфальтированной дороги	25 000,00	1525,48 + публикация в газете	2 500,00
4	Минская область, Узденский район, агрогородок Озеро, улица Приозёрная, участок № 14, кадастровый номер 625682508601000960	0,15	Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению. Подъезд с асфальтированной дороги	25 000,00	1525,49 + публикация в газете	2 500,00
5	Минская область, Узденский район, агрогородок Озеро, улица Приозёрная, участок № 12, кадастровый номер 625682508601000959	0,15	Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению. Подъезд с асфальтированной дороги	25 000,00	1525,49 + публикация в газете	2 500,00
6	Минская область, Узденский район, агрогородок Озеро, улица Приозёрная, участок № 10, кадастровый номер 625682508601000958 (повторно)	0,15	Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водоснабжению. Подъезд с асфальтированной дороги	25 000,00	1768,25 + публикация в газете	2 500,00
7	Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Светлая, участок № 8, кадастровый номер 625682504101000069 (повторно)	0,1499	Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги	18 000,00	1 441,07 + публикация в газете	1 800,00
8	Минская область, Узденский район, деревня Сороковщина, улица Цветочная, участок № 16, кадастровый номер 625682510101000149 (повторно)	0,1499	Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги	16 000,00	1 515,06 + публикация в газете	1 600,00
9	Минская область, Узденский район, деревня Нитиевские, улица Солнечная, участок № 2А, кадастровый номер 625682508101000067 (повторно)	0,1500	Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги	17 500,00	1 515,06 + публикация в газете	1 750,00

Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на расчетный счет № BY97AKBB36410625001436000000 в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, БИК AKBBBY2X, УНП 600110154, код платежа 4901. Получатель – Озерский сельский исполнительный комитет.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявление на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Озеро, ул. Дзержинская, 27б. Последний день приема заявлений – **26 февраля 2021 года до 17.00.** Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны предоставить следующие документы:

1) заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

3) копию документа, содержащего его идентификационные сведения (ксерокопию паспорта);

4) представителям гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, предоставляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукционов и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробную информацию об аукционах, условиях участия можно получить по телефонам: (801718) 65 3 82, 49-3-47, +375-29-5-65-91-60.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

«Амаль навагодняя» ці «амаль казка»? — падумаў я, калі пачынаў чытаць «Чужую мару» Алены Стэльмах. — Альбо і тое, і другое разам?» Але як бы я ні камбінаваў гэтыя словы, больш за ўсё мяне бянтэжыла адно з іх — «казка». Не ў якасці жанравага азначэння твора, а ў сэнсе адпаведнасці гэтага жанру ўмовам звяздоўскага конкурсу апавяданняў. Усё стала зразумела, калі «Чужая мара» была дачытана. Ад зусім рэалістычнай, мне нават падалося, асабіста-дакументальнай гісторыі, сапраўды, веяла нечым незвычайным, навагоднім, казачным. Веяла, чарговы раз пераконваючы, што і ў XXI стагоддзі самае дзівоснае і нават неверагоднае здараецца дзякуючы не навуковаму прагрэсу, а чалавечым адносінам.

Алесь БАДАК.

АЛЕНА СТЭЛЬМАХ

ЧУЖАЯ МАРА

Амаль навагодняя казка

– Ніколі ў жыцці не каштаваў зефір. Які ён? — дзяліўся сваёй запаветнай марай усхваляваны Сахін, калі даведаўся, што ў маёй краіне гэта адзін з любімых ласункаў.

Як было растлумачыць майму індыйскаму сябру, што ўяўляе сабой зефір, смак якога і зараз мне нагадвае дзяцінства?

Паказаць, як зефір выглядае дзякуючы сучасным прыстасаванням, — прасцей за ўсё. Націскаю на мабільніку некалькі кнопак і, калі ласка, любуйся, дарагі сябар.

— О, гэта снег! — узрадаваўся індыец майму фота зефіра ў прыгожай каробачцы. І з замілаваннем прызнаўся, што ён неаднойчы бачыў на малюнках, як дзеці гуляюць у снежкі.

— Так, ён падобны да снежак, — усміхнулася я трапнаму параўнанню чалавека, які ніколі ўжывую не бачыў снег. І дадала, на мой погляд, істотнае: — Толькі зефір не растае.

Але хутка адумалася:

— Чаму не растае? Гэта смаката нават лёгка растае...

— Ён белы, як і твая краіна — Беларусь? — не сунімаўся Сахін.

— Так, ён белы, як і белая, светлая мая краіна. А яшчэ яна зялёная, блакітная, залатая, — апісваю замежніку шматаблічную Беларусь, якая патанае ў высокіх лясах, глядзіць глыбокімі вачыма азёр, калосіцца спелай нівай.

На першы погляд, як цяжка людзям зразумець адзін аднаго! І нічога дзіўнага ў гэтым няма, тым больш, калі яны жывуць на розных кантынентах і маюць прынцыпова іншыя веравызнанні, этнакультуру, нацыянальныя традыцыі. Як і ў нашым з Сахінам выпадку: што для мяне — абсалютна знаёмае і простае, для яго — тайна за сямю пячаткамі. Як і блізкая яму старажытная Індыя для мяне — надзвычай загадкавая, нават містычная. Але калі ёсць узаемнае жаданне дабра, памкненні людзей высакародныя, іх душы чыстыя і адкрытыя, то адшукваюцца і шляхі для ўзаемаразумення, і знаходзіцца агульная мова. Як удалося і нам, валодаючы сваімі роднымі мовамі — мне беларускай, а яму хіндзі, — размаўляць на агульнай мове сяброўства.

Наша інтэрнэт-перапіска з індыйцам Сахінам Вагам доўжыцца ўжо болей за год. Скажу адразу, што да розных віртуальных знаёмстваў стаўлюся асцярожна. Не хочацца марнаваць час на пераліванне з пустога ў парожняе.

А гэты чалавек зачапіў мяне сваім інтэлектам, цікавасцю да літаратуры, павагай да працы пісьменніка.

Тэма, якая звязала нас бліжэй, — індыйскае кіно, такое папулярнае ў Беларусі, асабліва ў савецкі час. Тым больш што Сахін жыве ў Мумбаі, так званым Галівудзе, цэнтры індыйскай кінаімперыі. Падхопліваем вядомы жарт: калі ў амерыканскім або еўрапейскім фільме ружжо, што вісіць на сцяне, абавязкова выстраліць, то ў індыйскім — спяе і станцуе. Шкадуем, што ў красавіку гэтага года не стала нашага агульнага ўлюбёнца — найпапулярнейшага індыйскага акцёра Рышы Капура...

Паступова я ўсё больш пачынаю дазнавацца з вуснаў жыхара самага вялікага горада на захадзе Індыі, яе, дарэчы, і фінансавай сталіцы — Мумбаі, — як жывуць тут людзі розных рэлігій і кастаў.

Сахін працуе ў адной з аўтарытэтных мумбайскіх фірмаў, ахвотна запрашае мяне ў завочнае падарожжа. І я ўяўляю вытанчаныя хмарачосы са шкла і металу, прыгожа апранутых людзей, якія ездзяць на дарагіх машынах, побач таксі і папулярныя аўтарыкшы. Горад стракаціць шматлікімі кіёскамі з традыцыйнымі індыйскімі кветкамі і гірляндамі. Пра кароў — свяшчэных у Індыі жывёл — ведаю са школьнага падручніка. Неверагодна бачыць ажылую гісторыю, ад чаго перахоплівае дых: каровы ля храмаў і на вуліцах, іх лежні нават на стрэхах дамоў.

— Аднак Мумбаі вядомы і сваімі трушчобамі, — заўважае мой гід. — У вочы чалавека, які трапіць сюды ўпершыню, кінецца бедната і ўбогасць жытла. Але той, хто ўнікне ва ўнутраны свет трушчоб, па-іншаму зразумее іх парадак і арганізаванасць. Нягледзячы на беднасць трушчоб, адзенне і хаціны саміх насельнікаў заўсёды чыстыя і ахайныя. Тут за работай кожны працаздольны. Мужчыны занятыя ў розных майстэрнях, жанчыны вядуць хатнюю гаспадарку, гандлююць на мясцовым рынку. У трушчобах ёсць неафіцыйныя школы, дзе дзеці навучаюцца грамаце і вывучаюць азы матэматыкі. Жанчыны, як і паўсюдна, не страчваюць сваю жаноцкасць: у кожнай святочныя сары і некалькі залатых упрыгожанняў.

Разважаем з Сахінам пра шчасце, права на якое мае кожны, на якім бы лапіку зямлі ні жыў, якую б культуру ні нёс. Якое яно, такое жаданае, чаканае чалавечае шчасце? Дзе яму, здарожанаму, сяліцца зручней: пад дахам гарадскога гмаху ці на ўскрайку ў беднай хаціне?

Часта гаворым пра надвор'е, бо менавіта яно ў многім абумоўлівае лад жыцця жыхароў любой краіны. Я распавядаю Сахіну, як на маёй радзіме мяняюцца поры года: чым, напрыклад, вабіць восень, чаруе зіма. Сахін уражаны пачутым. У яго на пытанне пра надвор'е дзяжурны адказ — у нас спякота. А таму большую частку работы мумбайцы стараюцца выконваць раніцай або вечарам, днём адпачываюць у цені дрэў і будынкаў, хоць шматмільённы Мумбаі чымсьці нагадвае гуллівы вулей у любы час сутак. Дзякуючы цёпламу і вільготнаму клімату нават у гэтыя навагоднія дні можна купацца ў Аравійскім моры, на ўзбярэжжы якога знаходзіцца Мумбаі. Чуючы пра такую раскошу ў нашы золкія халады, я летуценна ўздыхаю.

— Беражы сябе! — неаднаразова заклікае Сахін у сваіх пасланнях.

За час нашага знаёмства Беларусь стала да яго значна бліжэй. Ён сочыць за навінамі, цікавіцца падзеямі, ведае пра злашчасны каранавірус і на нашай тэрыторыі.

Сахін расказвае, як Індыя, вельмі густанаселеная краіна, б'е рэкорды па захварэлых, як ад «каронаў» церпяць людзі. Некаторыя з-за эканамічных цяжкасцяў страчваюць работу, а гэта дадае трывог, хваляванняў. Так здарылася і з яго сябрам, пазбаўленым месца пераклад чыка.

— Беражы сябе! — настойліва паўтарае Сахін. А сам «падхопліваe» вірус, следам хварэе і ўся яго сям'я.

Я жадаю невядомым мне людзям у далёкай Індыі хутчэйшага выздараўлення, гэтак жа шчыра, як і маім землякам беларусам. Хачу, каб яны лёгка перанеслі небяспечную хваробу.

Пакуль цяжка разабрацца, навошта вірус «палюе» на нас. Але тое, што ён выпрабоўвае чалавецтва на чалавечнасць — гэта відавочна ўжо зараз. З гэтым згодны і мой далёкі таварыш Сахін з самай шматнацыянальнай краіны ў свеце.

Пры той велізарнай колькасці думак, што мільгаюць у галаве, усё ж значнай іх частцы ўласціва як нечакана з'явіцца, і гэтак жа хутка знікнуць. А вось тая мая, пра зефір — незабыўная. Яна, як падводная лодка, час ад часу ўсплывае на паверхню і падае напамінальны сігнал:

— Не расслабляйся. Тут я!

Мара Сахіна, які ніколі не каштаваў зефір, становіцца маёй неадчэпнаю марай — дапамагчы яму спраўдзіць яе.

Зефір, па праўдзе кажучы, у свеце і не такая ўжо рэдкасць. Яго называюць спрадвечна рускім дэсертам, да яго прыхільныя французы, і амерыканцам даспадобы яго падабенства — маршмэлоў. Але такога зефіру, як у нашым Бабруйску, напэўна, не вырабляюць нідзе. Традыцыі «Чырвонага харчавіка» — той рэдкі выпадак, калі праз многія гады ён не стаў, як кажуць, іголкай у стозе сене, не страціў натуральны смак гэтага пачастунку. Было, схапіліся і тут за падарунак прагрэсу — новую лінію. Дзве гадзіны і зефір — шпок, шпок, — гатовы. Але ж ён з тым, дзедаўскім метадам робленым, — далёкае сваяцтва, як яблык антонаўка, з якога вырабляюць зефір, і лясная яго сястра — дзічка. Таму вярнуліся майстры да выверанай класікі. Словам, быць сапраўднымі ва ўсім — адметная рыса характару беларусаў.

...Пасля глыбокай і нуднай восені, паснежанае чаканне Новага года надае новыя жыццёвыя рытмы. Асабліва абнадзейвае памятны з дзяцінства спадзеў на ажыццяўленне мар менавіта ў гэтую цудадзейную пару. І ў мяне нараджаецца Ідэя!

Кандытарская фабрыка знакаміты зефір адпраўляе ў 15 краін свету: ЗША, Канаду, Кітай... Індыі ў гэтым спісе няма. Дык, можа, мая маленькая пасылачка пракладзе дарогу беларускай смакаце і на паўднёваазіяцкі рынак? Раблю нясціплы замах на вялікія абставіны. Хоць і про першую ластаўку кажуць, што яна вясну не робіць. Але як сардэчна, калі яна прыляціць!

— Тэрмінова дашлі мне свой адрас! — прашу пагружанага ў свае справы Сахіна.

— Зефір. Ён атрымае зефір! — радуюся, старанна выводзячы англійскія літары ў змястоўным адрасе на лістку майго адрасата.

Дрыжачымі рукамі працягваю паштарцы каробачку. Яна афармляе пасылку — вельмі спакойна робіць звыклую для сябе справу. А маю душу напаўняе бурлівымі хвалямі Індыйскі акіян узнёслых пачуццяў. Быццам тут, у невялікім паштовым пакойчыку, надаю крылы руковай мары майго сябра. Праводжу вачыма каробачку, якая павольна плыве па спецыяльнай стужцы, якую запусціла паштарка. Па маіх разліках, Сахін атрымае падарунак менавіта на Новы год.

Спадарожнага табе ветру, мой «лёгкі, салодкі ветрык», як калісьці назвалі зефір грэкі!

...Час захоплівае мяне ў свае абдоймы, надае новых клопатаў. Успамін аб вабнай каробачцы адкладзены на дальнюю палічку памяці. Дзе той Мумбаі? Ад Мінска больш за сем тысяч кіламетраў...

І раптам у мабільніку, там, дзе вяду перапіску з Сахінам, бачу вокладку сваёй кнігі, каробачку з зефірам, іншыя беларускія пачастункі — усё тое, што адправіла яму.

— Прывітанне! Вялікі дзякуй за падарунак! — штабнуе мне Сахін, дасылаючы фотаздымкі ў знак пацверджання атрыманай карэспандэнцыі. — Мы адкрылі пасылку ўсёй сям'ёй. Ад нечаканай радасці на вачах у мяне, маёй жонкі, двух сыноў — слёзы. А мая старая маці літаральна плача. Яна шакіравана тым, як дайшла пасылка з такога далёкага краю! Яна бласлаўляе цябе! Малодшы сын скача: ён вельмі любіць шакалад, а твой — асабліві.

— Які смачны зефір! Асалода, калі ён растае ў роце! Я не магу нават уявіць, колькі намаганняў ты прыклала для таго, каб ажыццявілася мая мара! Напэўна, у тваёй краіне жывуць вельмі добрыя людзі. Кажуць, яны становяцца такімі ад салодкіх прысмакаў.

Мяне цешаць шчырасць і душэўная прыгажосць гэтага чалавека, яго родных.

— Сахін, дарагі! Ва ўсім свеце вельмі многа добрых людзей. І якое б было шчасце, калі б усе вакол дарылі адно аднаму слёзы радасці. Давай аб гэтым марыць разам! Марам уласціва збывацца — цяпер ты ведаеш гэта дакладна. Праўда, іншым разам для таго неабходна набрацца цярпення...

Дзякуючы Сахіну, і я ўсё больш паглыбляюся ва ўнікальную індыйскую культуру. Нечакана раблю для сябе чарговае цудоўнае адкрыццё. Аказваецца, гэта краіна — рэкардсмен па святкаванні Новага года. Хрысціяне яго надыход адзначаюць 1 студзеня, мусульмане — у першы дзень месяца мухарам (па ісламскім календары). Для некаторых Новы год пачынаецца ў канцы кастрычніка — пачатку лістапада, у дзень Дзівалі — «Фестывалю Агнёў».

Традыцыйны індыйскі год святкуецца 21—22 сакавіка, у першы дзень месяца Чайтра. Акрамя таго, у кожным штаце існуюць свае карэнныя трыдыцыі і даты навагодняй урачыстасці. А гэта азначае, што ў мяне ёсць яшчэ не адна прыемная магчымасць прыпаднесці мумбайскаму сябру сюрпрыз. Самой мне да ўсяго вельмі падабаюцца журавіны ў цукровай глазуры.

ШОКАВАЯ ХВАЛЯ

Чаму палякі выйшлі на вуліцы?

Польская паліцыя ўжыла слёзатачывы газ супраць пратэстоўцаў у Варшаве. Некалькі тысяч чалавек сабраліся на плошчы Рамана Дмоўскага ў цэнтры польскай сталіцы, паведаміла PIA «Навіны». Нягледзячы на папярэджанні паліцыі, яны выйшлі на праезную частку, перакрыўшы рух транспарту. Калонай з некалькіх тысяч чалавек пратэстоўцы рушылі па Іерусалімскіх алеях. Паліцыя паспрабавала выставіць на шляху калоны кардон, аднак удзельнікі акцыі абышлі яго па тратуары і працягнулі шэсце. Пратэстоўцы падпальвалі петарды і выбуховыя. Вартавыя парадку вырашылі затрымаць мікраўтобус з гукаўзмацняльнай апаратурай, што выклікала агрэсіўную рэакцыю ўдзельнікаў маршу. Падчас бойкі вартавыя парадку ўжылі слёзатачывы газ. Па словах лідара руху Strajk Kobiet, пацярпелі ад газу яна сама і кіроўца аўтобуса. Паводле звестак арганізатараў пратэстаў, падобныя акцыі на працягу некалькіх дзён праходзяць па ўсёй краіне. Чаму раз'юшаныя палякі выйшлі на вуліцы?

ВЯЧЭРНЯЯ ПУБЛІКАЦЫЯ

Урад Польшчы на мінулым тыдні ўрэшце апублікаваў у «Афіцыйным весніку» (што адметна — позна ўвечары) рашэнне Канстытуцыйнага суда рэспублікі аб забароне ў краіне абортаў з прычыны паталогіі плода, якая не пагражае жыццю і здароўю маці. Такім чынам, вердыкт, які выклікаў у краіне масавую хвалю пратэстаў, уступіў у сілу, паведаміла ТАСС.

Раней улады адкладалі публікацыю прынятага 22 кастрычніка мінулага года Канстытуцыйным судом рашэння аб забароне абортаў, аргументуючы гэтую адтэрміноўку неабходнасцю атрымаць пісьмовае абгрунтаванне. І нарэшце яно было надрукавана. Там сказана, што «чалавек з моманту зачацця мае права на жыццё», што гарантуецца канстытуцыяй Польшчы. Тлумачыцца, што афіцыйна аборт у краіне можна зрабіць у выпадку пагрозы жыццю і здароўю маці, калі ёсць высокая верагоднасць цяжкага і незваротнага паражэння плода да або невылечнага захворвання, небяспечнага для жыцця і здароўя маці, а таксама калі цяжарнасць наступіла з прычыны згвалтавання. Такія захворванні, як сіндром Даўна, будучая інваліднасць дзіцяці, верагоднасць цяжкага невылечнага захворвання, не могуць цяпер з'яўляцца падставай для аборту.

Як сцвярджаюць прыхільнікі вердыкту Канстытуцыйнага суда, іншага рашэння ў бягучай сітуацыі быць проста не магло, бо яно ішло б насуперак палажэнням Асноўнага закона краіны. Па іх словах, абгрунтаванне суда ўсё яшчэ пакідае магчымасць легальна перарываць цяжарнасць у складаных выпадках, бо палажэнне аб «пагрозе жыццю і здароўю маці» можна трактаваць і з пункту гледжання псіхічнага здароўя.

Гэты падыход у Польшчы называюць своеасаблівай прававой «шчылінай». Аднак, як сцвярджаюць эксперты, урачы не будуць так рызыкаваць і спрабаваць растлумачыць сваё рашэнне зрабіць жанчыне аборт з прычыны выяўлення ў плода, напрыклад сіндрому Даўна меркаваннямі яе псіхічнага здароўя. «Ні адзін урач-псіхіятр не скажа, што псіхічнае здароўе [у выніку нараджэння хворага дзіцяці] будзе падарвана настолькі, каб жанчына страціла дзеяздольнасць», — лічыць публіцыст Эліза Ольчык, якую цытуе ТАСС.

ПРАКЛЁНЫ, БОЙКІ І ПАГРОМЫ

Услед за абвяшчэннем абгрунтавання суда на вуліцах польскіх гарадоў аднавіліся масавыя акцыі пратэсту, якія былі відавочна ўмела «падагрэтыя». «Мы заклікаем усіх выйсці на вуліцу. І гэтым разам ісці па іх так, каб пакідаць сляды. Выкажыце свой гнеў так, як лічыце патрэбным. Гэта не мы пачалі», — звярнулася да патэнцыйных удзельнікаў пратэстаў адна з лідараў Strajk Kobiet Марта Лемпарт.

Тым жа вечарам — адразу пасля публікацыі ў «Афіцыйным весніку» — сотні ўдзельнікаў акцыі сабраліся каля будынка Канстытуцыйнага суда і заблакавалі вуліцу. Не абышлося і без абавязковага «перформансу» — непадалёк актывісткі разлілі на асфальце чырвоную фарбу і расклалі ў ёй плюшавыя цацкі. Паліцыя праз гучнагаварыцелі заклікала ўсіх прысутных разысціся, паколькі з-за пандэміі масавыя сходы ў краіне забароненыя.

Ад будынка суда разрослы, паводле звестак арганізатараў, да некалькіх тысяч натоўп адправіўся маршам цэнтральнымі вуліцамі горада, заблакаваўшы ў тым ліку ключавыя скрыжаванні. Мэтай пратэстоўцаў была штаб-кватэра кіруючай у рэспубліцы партыі «Права і справядлівасць». Аднак праход ушчыльную да будынка быў заблакаваны паліцэйскімі аўтамабілямі і ўзмоцненымі атрадамі паліцыі.

«Бясплатныя аборты для ўсіх па патрабаванні», «Свабода выбару замест тэрору», «Аборт — гэта права, а не прывілей» — абвяшчалі тэксты на транспарантах пратэстоўцаў. Арганізатары пратэстаў патрабавалі адстаўкі ўрада і сыходу кіруючай партыі Яраслава Качыньскага.

Па словах лідара Марты Лемпарт, штогод у Польшчы робяць каля 150 тысяч абортаў і з-за новай забароны сітуацыя не зменіцца. Дзеянні ўрада толькі правакуюць жанчын шукаць нелегальныя шляхі або магчымасці з'ехаць для перапынення цяжарнасці за мяжу. «Пытанне толькі ў кошце. Калі межы закрыюць, полькі будуць лятаць праз іх на верталётах», — заявіла яна ў ходзе апошняга пратэсту. Невыпадкова ў натоўпе пратэстуючых з'явіліся плакаты з надпісам: «Аборты для ўсіх, а не толькі для багатых».

Як заўважаюць эксперты, антыўрадавыя акцыі ўсё больш радыкалізуюцца. Напярэдадні дэманстранткі, якія прарываліся на тэрыторыю Канстытуцыйнага суда, параўноўвалі дэмарш са штурмам Капітолія. Адметна, што ў адной з экстрэмістак у руках быў плакат, зроблены спехам на кардоне са словамі: «Час для чарговага Смаленска». Надпіс — намёк зладзіць кіраўніцтву Польшчы нешта падобнае, што адбылося ў 2010 годзе, калі пад Смаленскам пацярпеў катастрофу прэзідэнцкі борт на чале з кіраўніком Польшчы Лехам Качыньскім, паведаміў eadaily.com.

«Праклёны, бойкі або знішчэнне маёмасці сталі пастаяннай часткай палітычнай барацьбы крайне левых за так званыя правы жанчын. Яны выкарыстоўваюць «вулічныя крытэрыі» для змены ўлады ў Польшчы. Як яны хочуць дасягнуць гэтай мэты? Банер «Час для чарговага Смаленска», які з'явіўся на мітынгу, шмат што тлумачыць», — заўважыла выданне Niezalezna.pl.

Польскія інтэрнэт-карыстальнікі не хавалі гневу: «У нармальнай краіне гэты выradак ужо сядзеў бы ў камеры»; «Калі паліцыя застанецца пасіўнай і пральецца кроў, то Польшча будзе аддадзена немцам у арэнду. Чым менш рэагуе паліцыя, тым больш дзёрзкімі становяцца гэтыя дзікуны»; «Лічу, што адукацыя ў нашай краіне ўпала, асабліва ў сучаснай гісторыі, таму ў нас ёсць інертная маса, успрымальная да лозунгаў без уласнага меркавання».

АДЦЯГНУЦЬ УВАГУ

Апазіцыя Польшчы пераканана, што канфлікт у грамадстве, які склаўся вакол абортаў, — гэта свайго роду прыкрыццё ва ўмовах вельмі складанай сітуацыі ў краіне ў сувязі з эпідэміяй каранавіруса, якая ўскладняецца з кожным днём, а таксама праблем з вакцынацыяй. Ужо некалькі тыдняў зачыненыя ўсе ўстановы культуры, спартыўныя комплексы, гасцініцы. Грамадзянам рэкамендавана заставацца дома і працаваць аддалена. Па ўсёй краіне ўведзены масачны рэжым, рэстараны, кафэ і бары працуюць выключна навынас. Школу наведваюць толькі малодшыя школьнікі, астатнія вучацца дыстанцыйна. Прадпрымальнікі пачынаюць пратэставаць і ўсё часцей насуперак забаронам аднаўляюць дзейнасць, рызыкуючы атрымаць вялікі штраф.

«Гэта правакаванне ідэалагічнай вайны ў самы цяжкі перыяд пандэміі каранавіруса», — ацаніў дэпутат Яцэк Протас з найбуйнейшай у Польшчы апазіцыйнай партыі «Грамадзянская платформа», паведаміла ТАСС. На думку парламентарыя, такім чынам улады спрабуюць адцягнуць увагу ад праблем, звязаных з забеспячэннем бяспекі палякаў ва ўмовах пандэміі і падтрыманнем эканомікі.

Некаторыя дэпутаты прапануюць уладам у гэтай сітуацыі правесці рэферэндум і змяніць канстытуцыю. Другія лічаць, што гэта недапушчальна. «Нельга праводзіць рэферэндум аб тым, падвяргаць жанчын катаванням або не, — заявіў у эфіры Польскага тэлебачання дэпутат левых сіл Пшэмыслаў Каперскі. — Гэта адпраўляе нашу краіну ў Сярэднявечча».

Дыскусія часта пераходзіць у вобласць філасофіі і спроб вырашыць пытанне аб тым, калі пачынаецца жыццё: ад моманту зачацця, дасягнення плодам пэўнага ўзроўню развіцця ва ўлонні або нараджэння дзіцяці. «Трэба памятаць, што прававыя нормы не павінны залежаць ад светапогляду», — сказаў у гэтай сувязі прафесар Мечыслаў Рыба. «Калі нейкая частка грамадства вырашыць, што яўрэі — не людзі, як ужо было ў XX стагоддзі, гэта не значыць, што яны маюць рацыю», — растлумачыў прафесар сваю пазіцыю.

Нягледзячы на хвалю грамадскага абурэння, у кіруючай партыі не плануюць уносіць змены ў дзеючае заканадаўства. Дэпутат ад «Права і справядлівасці» Марэк Сускі паказаў, што для пачатку трэба прааналізаваць рашэнне суда. «Аналіз зойме нейкі час. А ўжо пасля можна будзе сказаць, якім чынам дзейнічаць далей, — сказаў ён. — Пакуль размовы аб змене закона аб абортах не ідзе».

Адзін з галоўных лабістаў забароны абортаў, дэпутат Сейма Барталамей Урублеўскі, выступае за прыняцце закона, які нібыта звядзе да мінімуму негатыўныя наступствы рашэння Канстытуцыйнага суда для ўлады. Ён будзе прадугледжваць стварэнне пры польскіх радзільнях асобных палат для мам з цяжка хворымі нованароджанымі, а таксама адкрыццё перынатальных хоспісаў у кожным ваяводстве Польшчы. Акрамя таго, гэты закон павінен будзе ўвесці інструмент фінансавай дапамогі для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў.

РЭКОРДНАЯ СМЯРОТНАСЦЬ

Тым часам, стала вядома, што ў Польшчы летась зафіксаваны найвышэйшы ўзровень смяротнасці за перыяд з Другой сусветнай вайны, пры гэтым адзначаецца нізкая нараджальнасць. Аб гэтым паведаміла газета Dziennik Gazeta Prawna са спасылкай на статыстычныя даныя. Паводле гэтых даных, у Польшчы, насельніцтва якой складае больш за 38 мільёнаў чалавек, летась памерлі 486,2 тысячы. Таксама летась зафіксавалі 357,4 тысячы нараджэнняў, што з'яўляецца самым нізкім паказчыкам з 2005-га. Такім чынам, насельніцтва Польшчы зменшылася на 129 тысяч чалавек. Дарэчы, у 2019 годзе гэты паказчык склаў 36,4 тысячы.

Між тым даследчыкаў здзівіў нізкі ўзровень нараджальнасці, паколькі некаторыя эксперты прагназавалі яе ўсплёск ва ўмовах абмежавальных мер, уведзеных для барацьбы з каранавірусам. У 2019-м у Польшчы ў сярэднім штомесяц рэгістравалі па 30 тысяч смерцяў. У лістападзе мінулага года, калі ў краіне зафіксавалі ўсплёск COVID-19, памерла амаль 60,4 тысячы жыхароў. Высокі ўзровень смяротнасці захаваўся і ў першыя тры тыдні 2021-га, за якія зафіксавалі амаль 29 тысяч смерцяў.

Міністр па пытаннях сям'і і сацыяльнай палітыкі Марлена Малонг у сваю чаргу растлумачыла высокі ўзровень смяротнасці ўзнікненнем пандэміі каранавіруса. Яна падкрэсліла, што спатрэбіцца шмат часу, каб цяперашняя ўрадавая праграма па сямейных дапамогах, накіраваная на павышэнне нараджальнасці, выправіла сітуацыю.

Dziennik Gazeta Prawna заўважыла, што насельніцтва Польшчы змяншаецца на працягу апошніх 20 гадоў, асноўная прычына — міграцыя моладзі, якая імкнецца да больш шырокіх магчымасцяў. Па словах эканаміста Рафала Мундры, у гэты момант краіна сутыкаецца з «велізарным дэмаграфічным крызісам». «[Рашэнне суда] было іскрай. «Выбухоўка» была закладзена яшчэ раней. Нарасталі розныя праблемы, рэформы забуксавалі, цэны раслі, надзеі розных сацыяльных груп не апраўдаліся, спрэчкі з ЕС. Адчуванне канца карнавалу было паўсюдным», — адзначыў выданню Gazeta Wyborcza сацыёлаг Яцэк Рацыборскі.

Як чакаецца, у найбліжэйшыя дні антыўрадавыя дэманстрацыі ў Польшчы будуць працягвацца. «Мабілізацыя па ўсёй Польшчы (51 горад за тры гадзіны) паказала, што мы верым у тое, што ў гэтым ёсць сэнс... Убачымся на вуліцах!» — напісалі лідары пратэснага руху ў Facebook.

Пётр ДУНЬКО.

ДАСЛОЎНА

«Вы там самі разбярыцеся»

За мяжой не заклапочаныя інтарэсамі беларуская народа, там проста хочуць вырашыць свае праблемы за яго кошт. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы са студэнцкай моладдзю.

«І няўжо хтосьці ўсур'ёз думае, што там, за мяжой, моцна заклапочаныя інтарэсамі нашага народа? Не да Беларусі ім. А вось вырашыць свае праблемы за кошт беларусаў — гэта тэма», — заўважыў беларускі лідар. У прыклад ён прывёў сітуацыю ў Польшчы, дзе праходзяць пратэсты. На думку кіраўніка дзяржавы, справа не ў кропкавых праблемах, проста палякі не прымаюць цяперашнюю ўладу. «Дык чаго вы лезеце ў нашы праблемы? Вы там разбярыцеся. А чаго яны самі лезуць сюды? Каб адцягнуць ад сваіх праблем і заслаціць нашымі праблемамі», — упэўнены Прэзідэнт.

Наша бяспека

ГОРКІ МАЛЫЯ, ПРАБЛЕМЫ ВЯЛІКІЯ

Як дзецям пазбегнуць траўмаў зімой

Нарэшце выпаў снег і дзеці «захапілі» вялікія і маленькія горкі. Мае малыя не выключэнне, але яны вельмі сур'ёзна ставяцца да сваёй бяспекі. Справа ў тым, што аднойчы яны сталі сведкамі сур'ёзнай траўмы суседскага дзіцяці. Хлопец катаўся на цюбінгу, моцна стукнуўся аб дрэва, і яго павезлі ў бальніцу. Гэта жыццёвы ўрок для маіх дзяцей, але яшчэ больш жорсткі для траўміраванага хлопчыка. Кожную зіму дзіцячы траўматызм павялічваецца прыкладна на траціну. Якія траўмы тыповыя для гэтай пары года і як іх пазбегнуць?

Правілы паводзін дзяцей на прагулках зімой, апублікаваныя на сайце УАЗ «Гарадская станцыя хуткай медыцынскай дапамогі» Мінска, дазваляюць пазбегнуць атрымання траўмаў. А вось узмацніць кантроль за іх выкананнем — абавязак дарослых.

Менавіта дарослыя павінны пракантраляваць месцы, дзе гуляюць іх дзеці зімой. Схіл, які выбіраецца для спуску на санках ці лыжах, абавязкова павінен знаходзіцца ўдалечыні ад дарогі і павінен быць вольны ад палак і каранёў дрэў. Да дзіцяці неабходна давесці, што, катаючыся з заплюшчанымі вачыма, можна сутыкнуцца з суседам або дрэвам, а спуск спінай наперад зніжае магчымасць кіраваць санкамі, своечасова і адэкватна рэагаваць на небяспеку. Асабліва небяспечна чапляцца да транспартных сродкаў, прывязваць санкі «паравозікам» — перавярнуўшыся, адны санкі пацягнуць за сабой іншыя.

Калі вы вырашылі даверыць дзіцяці самастойна спусціцца з горкі на санках, раскажыце яму, што:

спускацца варта толькі з роўных схілаў, без трамплінаў, купін, дрэў або кустоў на дарозе; перад спускам трэба праверыць, ці вольная траса, ці не збіраюцца яе перасякаць з іншага схілу; на санкі садзяцца толькі верхам, трымаючыся за вяровачку. Ногі не ставяць на палазы, трымаюць з бакоў напаўсагнутымі; каб павярнуць убок, дастаткова спусціць нагу на снег з таго боку, у які хочаш развярнуцца; каб затармазіць, трэба апусціць на снег ногі і рэзка падняць перадок санак.

Навучыце дзіця падаць: у момант падзення яно павінна ўмець згрупавацца, збірацца ў камячок так, каб удар размяркоўваўся па як мага большай плошчы.

На каньках лепш за ўсё катацца ў спецыяльна абсталяваных месцах або на катках. Калі не атрымліваецца пазбегнуць зімовых гульняў на мёрзлым вадаёме, то дзеці павінны ведаць асноўныя правілы паводзін на лёдзе:

не выкарыстоўваць першы лёд для катання, малады лёд тонкі, нетрывалы і можа не вытрымаць вагі чалавека; пазбягаць месцаў, блізкіх да палонак, спускаў цёплай вады ад прамысловых прадпрыемстваў, рыбацкіх лунак і іншага; небяспечна выбягаць і скакаць на лёдзе, калі невядомая яго трываласць; не выпрабоўваць трываласць ільду ўдарамі нагой — можна праваліцца.

Ігра ў снежкі — яшчэ адна зімовая забава, якая можа прывесці да пашкоджанняў вачэй, таму задача дарослых — пераканаць малога берагчыся ад трапляння снегу ў твар і не кідаць у дзяцей снежкі з ледзяной скарыначкай і абледзянелымі кавалачкамі снегу.

Галалёд — даволі частая з'ява зімой, ён з'яўляецца прычынай мноства траўмаў і пераломаў. Папершае, правільна падбярыце дзіцяці абутак: перавагу лепш аддаць абутку з рабрыстай падэшвай без абцасаў. Па-другое, навучыце дзіця перамяшчацца па слізкай вуліцы: трэба не спяшацца, пазбягаць рэзкіх рухаў, пастаянна глядзець сабе пад ногі. Ногі павінны быць злёгку расслабленыя і сагнутыя ў каленях, корпус пры гэтым крыху нахілены наперад. Трымаць рукі ў кішэнях у галалёд небяспечна, пры падзенні не будзе часу іх дастаць і ўхапіцца за што-небудзь. Велізарную небяспеку ў галалёд уяўляюць прыступкі — пазбягайце іх, калі ж гэта немагчыма, то нагу пры спуску па лесвіцы неабходна ставіць уздоўж прыступкі, у выпадку страты раўнавагі такая пазіцыя змякчыць падзенне. Растлумачце дзіцяці, што ўвага і асцярожнасць — галоўныя прынцыпы паводзін, якіх варта няўхільна прытрымлівацца ў галалёд.

Яшчэ адна распаўсюджаная зімовая траўма — абмаражэнне. Пашкоджанне тканкі пад уздзеяннем холаду можа наступіць не толькі пры нізкіх тэмпературах паветра, але і пры тэмпературы вышэй за нуль, асабліва падчас вялікага снегападу, пры сырым надвор'і, вільготнай вопратцы, цесным абутку. Абмаражэнню падвяргаюцца часцей за ўсё пальцы рук і ног, шчокі, нос, вушы. Абмаражэнне часцей за ўсё наступае незаўважна, без болю, таму неабходна звяртаць увагу на пачырваненні твару ў дзіцяці (нармальны румянец — далікатна-ружовага колеру, калі ён стаў нераўнамерны, з ярка-чырвонымі або белымі плямамі — гэта абмаражэнне), правяраць адчувальнасць скуры твару, пастаянна варушыць пальцамі рук і ног. Каб пазбегнуць непрыемных наступстваў, правільна апранайце дзіця для прагулак на вуліцы: неабходныя рукавіцы — непрамакальныя, шалік, шапка з воданепранікальнага матэрыялу на цёплай падкладцы, абутак, які не сціскае канечнасці і не прапускае ваду. Скуру твару трэба засцерагаць спецыяльным дзіцячым крэмам.

Зімой да спіса траўмаў **дадаецца яшчэ і рызыка «прыляпіцца».** Паспрабуйце даходліва растлумачыць дзіцяці, што ў мароз нельга лізаць языком жалезныя канструкцыі і дакранацца да іх мокрымі рукамі, бо можна «прыляпіцца». Нагадайце, што не трэба праводзіць эксперыменты.

Калі дзіця захапляецца зімовымі відамі спорту, паклапаціцеся не толькі пра яго спартыўную экіпіроўку, але і пра накаленнікі, налакотнікі, засцярогу для пазваночніка. Яны дапамагаюць у значнай меры паменшыць верагоднасць атрымання траўмаў.

Узімку ўзрастае колькасць дарожна-транспартных траўмаў. Часта дзіця бачыць, што машына набліжаецца, але спадзяецца праскочыць. Аднак на слізкай дарозе кіроўца не паспявае затармазіць, паколькі павялічваецца тармазны шлях аўтамабіля. Перасякаць праезную частку дарогі неабходна выключна па пешаходным пераходзе, ні ў якім разе не перабягаць у недазволеным месцы. Абавязкова выконваць правілы дарожнага руху.

Многіх сур'ёзных траўмаў можна пазбегнуць, калі ўважліва сачыць за сваімі дзецьмі і клапаціцца, каб іх асяроддзе было бяспечным.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАБАРОНЕНА

- ✓ прывязваць цюбінг да транспартных сродкаў;
- ✓ здзяйсняць любыя дзеянні, якія перашкаджаюць іншым;
- ✓ курыць на схіле;
- ✓ катацца на адным цюбінгу двум і больш чалавекам;
- ✓ катацца ў вопратцы ці абутку, здольных пашкодзіць цюбінг;
- ✓ мець пры сабе вострыя або староннія прадметы;
- ✓ скакаць і катацца стоячы;
- ✓ катацца, не трымаючыся за ручкі;
- ✓ ставіць ногі ўнутр цюбінга;
- ✓ катацца дзецям да 6 гадоў;
- ✓ катацца дзецям ад 6 да 12 гадоў без нагляду дарослых;
- ✓ катацца ў стане алкагольнага і наркатычнага ап'янення;
- ✓ ажыццяўляць кантроль за дзецьмі ў стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення.

ПРАВІЛЫ КАРЫСТАННЯ ЦЮБІНГАМ

- ✓ неабходна сувымяраць вышыню спуску і складанасць трасы з уласнымі сіламі;
- ✓ перад спускам агледзець трасу на адсутнасць прадметаў, якія могуць пашкодзіць цюбінг (камяні, мёрзлыя камякі зямлі, сукі, шкло і г. д.);
- ✓ на адным цюбінгу дазваляецца спуск аднаго дарослага чалавека вагой не больш за 100 кг для вялікага і не больш за 50 кг для малога цюбінга;
- ✓ катацца можна толькі ў строга адведзеным для гэтага месцы;
- ✓ перад спускам з горкі трэба правяраць, што на дарозе няма людзей;
- ✓ у працэсе катання трымацца за спецыяльныя рамяні, размешчаныя па баках цюбінга, а вяровачка павінна знаходзіцца ўнутры цюбінга;
- ✓ дзеці ад 6 да 12 гадоў дапускаюцца толькі ў суправаджэнні дарослых.
- ✓ Пры масавым катанні неабходна выконваць правілы бяспекі для навакольных.

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛЮТЫ

2 лютага, аўторак. Праца майстра над вобразам і прычоскай сёння дазволіць выглядаць вам захапляльна ўвесь месяц.

3 лютага, серада. З дапамогай нажніц можна дамагчыся ўмацавання валасоў, павелічэння іх гушчыні і жорсткасці. Тыя, у каго і так на галаве пышны вожык, павінны ўстрымацца ад паходу ў салон прыгажосці.

4 лютага, чацвер. Прастата і прыродная натуральнасць сёння ў фаворы. Пазбягайце падстрыгання, укладак і перафарбоўвання. Настолькі павышана ўсеагульная энергетыка, што са стрыжкай не варта рызыкаваць, можна нашкодзіць асабістаму дабрабыту.

5 лютага, пятніца. Дзень рашучых перамен. Падстрыжыце хоць бы канцы валасоў або грыўку. Можна прымаць смелыя рашэнні, прычоска палепшыць настрой, падорыць новыя сустрэчы, дасць новыя эмоцыі.

6 лютага, субота. Дзень выдатна падыходзіць для любых працэдур, звязаных з валасамі. Падстрыгшыся, вы абудзіце ў сабе небывалы творчы патэнцыял, зможаце рэалізаваць незвычайныя ідэі.

7 лютага, нядзеля. Гэты перыяд для стрыжак лічыцца нейтральным. Рост валасоў можа значна прыпыніцца.

8 лютага, панядзелак. Пасля стрыжкі валасы будуць адрастаць павольна. Камусьці гэта спадабаецца, бо стрыжка доўга захавае форму. А хтосьці будзе незадаволены, калі ён хацеў падстрыгчы канцы валасоў для іх росту. Сама стрыжка выйдзе якаснай, акуратнай, але без фантазіі. Лепш за ўсё атрымліваюцца класічныя стрыжкі.

9 лютага, аўторак. У гэты дзень можна стрыгчы валасы, праводзіць эксперыменты, кардынальна мяняць даўжыню і колер валасоў. Стрыжка зробіць валасы больш паслухмянымі, зменшыць выпадзенне і падорыць велізарную колькасць жыццёвай энергіі.

10 лютага, серада. Стрыжка прынясе хаос і блытаніну, гэты месяцавы дзень адзін з самых складаных і неспрыяльных дзён месяца. Афарбоўванне таксама не рэкамендуецца.

11 лютага, чацвер. Валасы пакідаем той жа даўжыні, не бяромся за нажніцы. Робім фантазійныя і лёгкія прычоскі, марым пра выдатнае і станоўчае, у тым ліку пра новую стрыжку.

12 лютага, пятніца. Неспрыяльны дзень для стрыжкі валасоў. Этап узмацнення інтуіцыі, пажадана самастойна папрацаваць над сваімі валасамі, зрабіць пажыўную або ўвільгатняльную маску, чужыя рукі адштурхоўваюць паток энергіі.

13 лютага, субота. Сёння лепш адкласці візіт да цырульніка, а таксама ўсе маніпуляцыі з шавялюрай.

14 лютага, нядзеля. Нейтральны дзень для стрыжкі валасоў, вечарам стрыгчы валасы не рэкамендуем.

15 лютага, панядзелак. Стрыжку рэкамендуем адкласці на пару дзён, бо яна можа змяніць у горшы бок структуру валасоў і справакаваць выпадзенне.

16 лютага, аўторак. Неспрыяльны дзень для стрыжкі валасоў. Умацаванне валасоў бясколернай хной зробіць іх больш шаўкавістымі, можна выкарыстоўваць гаючыя маскі.

17 лютага, серада. Новая прычоска дадасць свежых сіл, дапаможа прыняць правільнае рашэнне, унясе ў жыццё разнастайнасць і новыя ўражанні.

18 лютага, чацвер. Добры дзень для змены іміджу, новай прычоскі і афарбоўвання валасоў у больш светлае адценне.

19 лютага, пятніца. Складаны час, празмернасць адмоўнай энергіі, нават не думайце ў гэты дзень падстрыгчыся або афарбаваць свае валасы.

20 лютага, субота. Пасля стрыжкі валасы будуць хутка расці, але іх структура і стан не змяняецца. Новая прычоска прынясе фінансавы дабрабыт і поспех у працы.

21 лютага, нядзеля. Стрыжка будзе ўдалая і карысная, валасы стануць больш «жывымі», густымі.

22 лютага, панядзелак. Стрыжка ў гэты дзень неспрыяльная, прынясе засмучэнне і ўвядзе ў стан меланхоліі і апатыі, таму паход у цырульню лепш адкласці.

23 лютага, аўторак. Стрыжка зробіць валасы непаслухмянымі, цяжкімі, укладка будзе дрэнна трымацца, прычоска не прынясе жаданага выніку.

24 лютага, серада. Выдатны дзень для стрыжкі, афарбоўкі валасоў, можна смела адпраўляцца ў цырульню.

25 лютага, чацвер. Цудоўны дзень для стрыжкі — яна дапаможа вызначыцца, чаго вы хочаце ад асабістага жыцця, абзавесціся прыемнымі і перспектыўнымі знаёмствамі, прыцягне да вас новыя яркія ўражанні.

26 лютага, пятніца. Новая стрыжка і афарбоўка валасоў у натуральныя адценні дадасць сіл, створыць выдатны настрой і прынясе ўдачу.

27 лютага, субота. У дзень поўнага Месяца лепш не выпрабоўваць фартуну і даць валасам застацца натуральнымі.

28 лютага, нядзеля. Месяцавы гараскоп ў гэты перыяд настройвае нас на рамантычны лад, і стрыжка ў дванаццаты месяцавы дзень можа змяніць ваша асабістае жыццё ў лепшы бок, але варта ўдумліва падысці да выбару новай прычоскі.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 11 февраля 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: 1. Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества, на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Земельный участок под объекты продажи **(лот № 3)** будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Информация о земельном участке:** лот № 3 расположены на земельном участке с кадастровым номером **340800000004000100** общей площадью **10,7667 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания производственных зданий завода		
3	**Капитальное строение с инв. № 320/С-37325** площадью **0,00 кв. м**, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – **мазутохранилище.** Составные части и принадлежности: мазутохранилище с резервуаром (а), пл. 72,9 кв. м, мазутохранилищем, общей пл. 50,7 кв. м, гаражами (Б), общей пл. 97,9 кв. м, железобетонное ограждение, 69 м. п. Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8/18	**25 108,30**	2 510,83
7	Стол холодильный СХС-70-011, (инв. № 61272)	**480,00**	48,00
8	Сковорода электрическая секционная СЭС-0,25/2, (инв. № 61192)	**210,00**	21,00
9	Шкаф жарочный, (инв. № 60020)	**195,00**	19,50
10	Шкаф пекарный, (инв. № 1341)	**222,00**	22,20
12	Машина стиральная В10-332, (инв. № 61382)	**1 260,00**	126,00
13	Машина стиральная В35-322, (инв. № 61336)	**2 850,00**	285,00
14	Машина разрывная, (инв. № 60151)	**3 540,00**	354,00
15	Плита монтажная 3000*1500, (инв. № 60940)	**5 130,00**	513,00
